# СВЕТЛАЕ СВЯТА ВЯЛІКАДНЯ

**Віншаванне Прэзідэнта з Уваскрэсеннем Хрыстовым**

***Праваслаўным хрысціянам Беларусі***

***Дарагія суайчыннікі!***

***Ад усёй душы віншую вас з Уваскрэсеннем Хрыстовым.***

***У гэтае вялікае свята мы ўспамінаем аб выратавальнай ахвяры, якая азнаменавала перамогу дабра над злом, святла над цемрай, жыцця над смерцю.***

***Велікодны дабравест нараджае ў нашых сэрцах веру, надзею і любоў, пабуджае задумацца аб высокім прызначэнні чалавека. У такія імгненні мы з асаблівай вастрынёй адчуваем неабходнасць яднання, узаемнай падтрымкі, захавання духоўных каштоўнасцяў, імкненне адрадзіць і прымножыць багатыя традыцыі нашага народа.***

***Хачу пажадаць, дарагія землякі, каб дні святкавання Вялікадня прынеслі мір і згоду ў вашы сем'і, адарылі вас вясеннім цяплом і радасцю стасункаў, натхнілі на добрыя справы.***

***Моцнага вам здароўя, дабрабыту і шчасця.***

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

# З ПЕРШАМАЕМ!



***Паважаныя суайчыннікі!***

***Сардэчна віншую вас са Святам працы!***

***Па добрай традыцыі гэта дата ў Беларусі адзначаецца яркімі маляўнічымі ўрачыстасцямі, з асаблівай павагай да тых, хто сваімі розумам і талентам ставарае галоўныя каштоўнасці на Зямлі.***

***Дзякуючы паважліваму стаўленню нашага грамадства да працоўных, імкненню жыць у міры і згодзе, дзяржава паспяхова развіваецца, даючы кожнаму чалавеку ўпэўненасць у заўтрашнім дні.***

***Высокая кваліфікацыя работнікаў набывае ўсё большае значэнне ў сучаснай эканоміцы і служыць надзейным фундаментам для дабрабыту нашых сем'яў. Сёння вельмі патрэбны прафесіяналы, чый узровень ведаў і навыкаў адпавядае сучасным патрабаванням.***

***Упэўнены, што сумеснымі намаганнямі мы ўмацуем нашу краіну, зробім яе камфортнай і прывабнай. Няхай гэта цудоўнае свята надасць вам аптымізму, веры ва ўласныя сілы, паслужыць стымулам да далейшага развіцця і працвітання.***

***Жадаю ўсім моцнага здароўя, шчасця і дабрабыту.***

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**


Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

30 КРАСАВІКА 2016 г. СУБОТА № 81 (28191) Кошт 2400 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Жыхары вёскі Новы Быхаў Быхаўскага раёна з нецярпеннем чакаюць Вялікадня і па традыцыі збіраюцца на высокім беразе Дняпра для асвячэння велікодных яек і кулічоў.**

# Ад зямлі да неба

## Велікоднае пасланне мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага Паўла, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі, архіпастырам, пастырам, дыяканам, манахам і міранам Беларускай Праваслаўнай Царквы

*Ад смерці да жыцця і ад зямлі да неба*
*Хрыстос Бог правёў нас, якія песню перамогі спяваюць.*

**Пасхальны канон. Песня 1. Ірмос**

Узлюбленыя ва Уваскрэслым Госпадзе нашым Ісусе Хрысце Праасвяшчэнныя архіпастыры, шаноўныя прасвітары і дыяканы, богалюбівыя інакі і інакіні, браты і сёстры, усе верныя сыны і дочкі Беларускай Праваслаўнай Царквы!

Вітаю вас вечна жывымі словамі пасхальнага дабравесця, духоўна радуючыся і лікуючы разам з вамі:

Хрыстос Уваскрэс!

Міласцю Божай мы дасягнулі светлага дня Пасхі! З таго моманту, як апосталы абвясцілі свету пра Уваскрэсенне Спасіцеля нашага Госпада Ісуса Хрыста, пастаянная радасць напаўняе жыццё нашай Царквы: Хрыстос уваскрэс з мёртвых — і смерць пераможана! Усё жыццё хрысціяніна павінна быць напоўнена пасхальнай радасцю. Кожная нядзеля — гэты дзень Уваскрэсення — паказвае нам вялікі подзвіг Спасіцеля і паўнату Божай любові. Прыйшоўшы ў свет у плоці, Хрыстос Спасіцель ацаліў чалавечую прыроду ад хваробы граху і, сышоўшы ў пекла, зруйнаваў кайданы смерці, даўшы нам магчымасць узыходзіць у жыццё вечнае ў Яго Нябесным Царстве.



Першае слова, якое прамовіў Уваскрэслы Хрыстос, звяртаючыся да жанчын-міраносіц, а затым і да апосталаў, было «Радуйцеся!». У гэты зіхатлівы дзень, які сапраўды вядзе нас «ад смерці да жыцця і ад зямлі да неба», Царква Хрыстова радуецца, вітаючы Бажэственнага Пераможцу смерці: *«І ўзрадаваліся вучні, убачыўшы Госпада»* (Ін. 20: 20).

Радасная песня аб Уваскрэсенні Хрыстовым гучыць і ў кожным з нас: мы радуемся таму, што адбылася найвялікшая падзея — Хрыстос Спасіцель Сваёю смерцю знішчыў саму смерць: *«Сіло парвалася — і мы выратаваны. Дапамога наша ў імені Госпада»* (Пс. 123: 7—8). Радуемся мы і таму, што нам, якія веруюць у Яго, Ён завяшчае жыццё вечнае. І таму, хто будзе выконваць Яго Бажэственныя запаведзі і жыць згодна з Евангеллем, Гасподзь абяцае Царства Нябеснае: **«Я — уваскрэсенне і жыццё; хто веруе ў Мяне, калі і памрэ, будзе жыць»** (Ін. 11: 25).

Будзем жа радавацца, таму што мы маем цудоўную і непахісную аснову нашай веры — Уваскрэсенне Хрыстова! Ва Уваскрасенні Хрыстовым — абяцанне, што смерць на зямлі — не канец жыцця, што смерць сілаю Божаю пераадольваецца. Ва Уваскрэсенні Хрыстовым — пачатак нашага асабістага ўваскрэсення. Як смяротныя мы падаем, але як бессмяротныя ўваскрасаем у жыццё вечнае з Хрыстом Спасіцелем. Няхай гэтая радасць нашага агульнага ўваскрэсення ўмацоўвае нас, дапамагае пераадольваць цяжкасці, з якімі нам давядзецца яшчэ сустрэцца на жыццёвым шляху.


**СТАР. 3**


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Міхаіл ОРДА, старшыня Федэрацыі прафсаюзаў:**

*«Недапушчальна вырашаць праблемы прадпрыемства выключна за кошт інтарэсаў людзей. Напрыклад, зараз пастаўлена задача скараціць выдаткі вытворчасці на 25%. І мы разумеем, што ў кіраўніцтва прадпрыемствам можа ўзнікнуць жаданне дамагчыся гэтага за кошт інтарэсаў людзей — зразаючы выплаты, а то і звальняючы. На наш погляд, вырашаць пастаўленыя задачы такім чынам недапушчальна. Мы будзем уважліва сачыць за сітуацыяй у гэтым плане».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 30.04.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 19214,00 | ▼ |
| Еўра | 21917,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 298,67 | ▲ |
| Укр. грыўня | 762,16 | ▼ |


ISSN 1990 - 763X

■ На думку парламентарыя

# НАВОШТА НАМ ІМПАРТНАЯ БУЛЬБА?



**У Пасланні беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу кіраўнік дзяржавы, гаворачы пра сельскую гаспадарку, падкрэсліў, што гэта сфера вызначае не толькі харчовую бяспеку краіны, але і забяспечвае наш экспартны патэнцыял. У сувязі з гэтым вельмі важна, каб стратныя прадпрыемствы галіны як мага хутчэй выходзілі на самаакупнасць. Дэпутат Уладзіслаў ЦЫДЗІК, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па аграрнай палітыцы, выказаў свой погляд на тое, як вырашыць пастаўленую задачу.**

— Мы, беларусы, вельмі працавітыя. Але калі прадпрыемства «ўвязла ў балоце», то людская праца, можна сказаць, прападае дарма. Прычын стратнасці шмат: гэта і недахоп кадраў, і даўгі. Па звестках Міністэрства сельскай гаспадаркі, у галіне больш за 300 праблемных арганізацый. Па кожнай з іх ужо вядзецца адпаведная праца: адны плануецца далучыць да іншага прадпрыемства, на базе другіх сфарміраваць фермерскія гаспадаркі, трэція — прадаць. Праўда, тут узнікае іншая праблема — набываць стратнае прадпрыемства не жадае амаль ніхто. Раней, згодна з адпаведнымі ўказамі Прэзідэнта, такія арганізацыі прадаваліся за 20% ад рэальнага кошту. Магчыма, цяпер трэба ісці па гэтым шляху актыўней. Так ці інакш, у нашай краіне зямля не застанецца без гаспадара. Будуць прымацца меры, і паступова гаспадаркі з нерэнтабельных будуць пераходзіць у сярэднія, а потым — і ў перадавыя.

Трэба сказаць, што за апошнія гады наша сельская гаспадарка стала валютаўтваральнай для краіны. За 2014 год мы зарабілі 5,8 мільярда долараў, за «крызісны» 2015-ы — 4,9 мільярда. Паступова сельскагаспадарчыя прадпрыемствы пачынаюць акупляцца, але гэта за кошт перадавых гаспадарак.

Што да імпартазамяшчэння, якому Прэзідэнт таксама надаў значную ўвагу ў сваім пасланні, то яно, безумоўна, павінна быць разумным. У сельскай гаспадарцы вельмі важна пераходзіць на сваю бялковую сыравіну для жывёлагадоўчай галіны, якая, дарэчы, дастаткова дарагая. Летась на яе імпарт было патрачана каля 300 мільёнаў долараў. У нас цяпер у добрых аб'ёмах нарыхтоўваецца рапс, але трэба больш увагі ўдзяляць і іншым «бялковым культурам». Трэба больш нарыхтоўваць гароху, лубіну, кармавых бабоў — апошнія, дарэчы, вельмі выгадная культура: на гектары зямлі іх нарасце каля 50 цэнтнераў. Мы павінны выкарыстаць нашы кліматычныя ўмовы, якія рэальна даюць магчымасць забяспечыць вытворчасць бялкоў у дастатковай колькасці.

Зноў жа, дзіўны факт: мы ў вялікіх аб'ёмах імпартуем проса, якое цудоўна расце і ў нас, прычым нават на бедных глебах. Непрымальна, што ў нашых магазінах такая колькасць імпартнай бульбы, яблыкаў. Сітуацыю трэба мяняць.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

■ Дыялог бізнесаў

# ЭКСПАРТУЕМ ТЭХНАЛОГІІ Ў АФРЫКУ

## У Мінску падпісалі шэраг пагадненняў аб кааперацыі з Суданам

**У сталіцы адбылося трэцяе пасяджэнне беларуска-суданскай сумеснай камісіі па супрацоўніцтве. Беларускую дэлегацыю на пасяджэнні ўзначаліў міністр энергетыкі Беларусі Уладзімір ПАТУПЧЫК, суданскую дэлегацыю — міністр нафты і газу Судана Махамед Заед АВАД. Бакі разгледзелі перспектыўныя кірункі развіцця ўзаемнай гандлёва-эканамічнай кааперацыі. Акрамя таго, праводзіліся перамовы аб магчымасцях супрацоўніцтва і рэалізацыі сумесных праектаў у сферы здабычы, транспарціроўкі і рэалізацыі нафтапрадуктаў, кансалтынгу, пастаўках тэхнікі і абсталявання.**

Па словах **старшыні Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Міхаіла МЯТЛІКАВА**, гандлёвыя адносіны паміж нашай краінай і Суданам не збалансаваны. Таварная наменклатура таксама досыць вузкая: сельгастэхніка, шыны, аптычная прадукцыя. Разам з тым Судан з'яўляецца нашым важным партнёрам на Афрыканскім кантыненце, праз якога наша краіна можа пашыраць сваё супрацоўніцтва з астатнімі дзяржавамі на гэтай тэрыторыі. Для пашырэння ўзаемадзеяння ў складзе суданскай дэлегацыі таксама прыбылі прадстаўнікі трынаццаці буйных кампаній. Асаблівую цікавасць яны праявілі да беларускіх тэхналогій геолагаразведкі ў галіне нафтаздабычы, а таксама да сельгасмашынабудавання. Беларусаў ужо зацікавілі суданская баваўна, газ і нафтапрадукты.

Як адзначыў Уладзімір Патупчык, прадстаўнікі дзвюх краін дэталёва прапрацавалі пытанні кааперацыі. Ужо па заканчэнні сустрэчы адбылося выніковае падпісанне пратакола пасяджэння сумеснай камісіі па супрацоўніцтве і мемарандумаў узаемаразумення паміж галіновымі органамі кіравання дзвюх краін. Падпісаныя дакументы дазволяць палепшыць узаемадзеянне ў сферы прамысловасці, сельскай гаспадаркі, энергетыкі, навукі і тэхналогій.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *Kryzhevich@zviazda.by*

■

■ Шпацыр па Камароўцы

# ЯЙКІ БЯРУЦЬ ЛАТКАМІ...

**Перад апошнімі выхаднымі красавіка на рынку не прайсці — людзі спяшаюцца падрыхтавацца да свята. Назіраю вялікія чэргі па самы запатрабаваны прадукт — курыныя яйкі, і сама станаўлюся ў адну з іх. Людзі бяруць іх латкамі па некалькі дзясяткаў: адборныя аддавалі па 19 тысяч рублёў, першай катэгорыі — па 17, у іншым месцы яны былі са зніжкай — па 15 тысяч рублёў за дзясятак. Два дзясяткі перапяліных яек у скрынках каштавалі па 27 альбо 30 тысяч рублёў.**

Самы час паласавацца вітаміннымі салатам з радысу, агуркоў, пятрушкі і зялёнай цыбулі. За якую суму атрымаем такі пачастунак? Радыску амаль паўсюль прапануюць па стандартным кошце — 21-22 тысячы рублёў за пучок. Аднак калі пахадзіць і прыглядзецца больш уважліва, можна знайсці па 6-7 тысяч рублёў танней. Агуркі пад інтрыгуючай назвай «Кураж» ідуць па 32 тысячы рублёў за кілаграм. Пучкі пятрушкі і кропу аддаюць па 6 тысяч рублёў, цыбулю-пяро — па 3-5 тысяч рублёў. Памідоры, у адрозненне ад агуркоў, прадстаўлены ў асартыменце значна шырэй: іспанскія таматы каштуюць 30 тысяч рублёў за кілаграм, беларускія — па 15 тысяч даражэйшыя, невялічкія «чэры» — па 45-50 тысяч рублёў, а польскія «малінавыя» станучь вашымі за 60-70 тысяч рублёў. Балгарскія перцы трапіліся як па кошце 25 тысяч рублёў за кілаграм, так і па 60-75 тысяч рублёў, што роўна двум кілаграмам цукіні альбо белай рэдзькі. Некаторыя гаспадыні любяць дадаваць у салату чырвоную цыбулю. Кілаграм бардовых ялцінскіх цыбулін аблегчыць ваш кашалёк на 50 тысяч. Айчынная цыбуля ідзе па 14-15 тысяч за кілаграм, затое цыбуля-сявок — па 55 тысяч рублёў за кілаграм. Буракі і морква прыкладна ў адной коштавай катэгорыі — 11-12 тысяч рублёў за кілаграм. Часнок аддаюць паштучна — 8 тысяч рублёў за галоўку.

Які ж вясенні салат без дапаўнення — звараной маладой бульбачкі? Прапануюць яе па 30-35 тысяч рублёў за кілаграм. Бульба «ва ўзросце» значна таннейшая: можна адшукаць і па 6, і па 8 тысяч рублёў за кілаграм. Душа жадае чаго іншага? Калі ласка: бачкавыя агуркі ёсць у наяўнасці па 30 і па 40 тысяч рублёў за кіло. Квашаную капусту аддаюць за 30 тысяч рублёў, а свежую — за 20 тысяч рублёў за кілаграм.

Каля прылаўкаў з айчыннай садавінай назіраю невялікі ажыятаж: людзі актыўна бяруць беларускія яблыкі. Выбраць з чаго ёсць: тут і «ананасавыя», і «яблык-груша», «дэ коста» па 16 тысяч рублёў за кілаграм, і буйныя чырвоныя прыгажуны «чорны прынц» (даражэйшыя на 4 тысячы рублёў). Груша «канферэнцыя» атрымлівае́цца ў сярэднім па 27 тысяч рублёў за кілаграм, а сакавіты «дзюшэс мядовы» даражэйшы на 10 тысяч рублёў.

Пошукі танных бананаў скончыліся няўдала: лепшы варыянт, які мне трапіўся, быў з пазнакай «27» на цэнніку. Многія прадаўцы аддаюць спелыя вялікія бананы не менш як па 30 тысяч рублёў за кіло. Нават італьянскія ківі выходзяць танней на 5 тысяч рублёў за кілаграм. А іспанскія апельсіны і мандарыны, наадварот, атрымліваюцца даражэйшымі за бананы на 5 тысяч рублёў. Дарэчы, фаварытам мінулага месяца — апельсінаў гатунку «вашынгтон» — на гэты раз на прылаўках не аказалася.

Даволі шмат на прылаўках і грэцкіх клубніц: кілаграм гэтага смакоцця аблегчыць ваш кашалёк на 85 тысяч рублёў. Вялізныя спакуслівыя гранаты каштуюць даволі прыстойна — 70-80 тысяч рублёў за кіло — за такія грошы прапануюць і кілаграм ананасаў. На іншым прылаўку ўбачыла проста багатырскія плады: перуанскія гранаты па 150 тысяч рублёў — для дакладнасці даваласся перазапытаць пра кошт. Але ў маёй торбе ўжо назбіраліся яблыкі і грушы розных сартоў, таму сустрэчу з загадкавымі гранатамі давялося адкласці на наступны раз.

**Кацярына РАДЗЮК.**

■

**Лічыльнік «Звязды»**
(цэны за кілаграм, калі не пазначана іншае)

**Сала хатняе, салёнае — 100-145 тыс.**
**Сала вэнджанае — 150 тыс.**
**Свініна (кумпяк) — 90-120 тыс.**
**Цяляціна (кумпяк) — 120-150 тыс.**
**Курыца (філе) — 60 тыс.**
**Кураня бройлернае — 34 тыс.**
**Фарш (свініна-цяляціна) — 60 тыс.**
**Паляндвіца — 200 тыс.**
**Бастурма (ялавічына) — 270 тыс.**
**Сардэлькі (цяляціна) — 80 тыс.**
**Карэйка вострая — 140 тыс.**
**Акунь сыравэнджаны — 165 тыс.**
**Селядзец атлантычны салёны — 70 тыс.**
**Фарэль слабасалёная — 450 тыс.**
**Масла вяршковае (200 г) — 16-19 тыс.**
**Алей рафінаваны (1 л) — 23-25 тыс.**
**Грэчка (800 г) — 19 тыс.**
**Рыс «Жасмін» (800 г) — 19 тыс.**

## ЗАО «Универсам «Центральный»

Учетный номер плательщика: 100060965
Вид экономической деятельности: розничная торговля
Организационно-правовая форма: Закрытое акционерное общество
Орган управления: Юр. лицо без ведомственной подчиненности
Единица измерения: млн руб.
Адрес: г. Минск, пр-т Независимости, д. 23

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2016 года

| АКТИВЫ | Код строки | На 31 декабря 2015 года | На 31 декабря 2014 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 13 655 | 14 506 |
| Нематериальные активы | 120 | 219 | - |
| Доходные вложения в материальные активы | 130 | - | - |
| В том числе: инвестиционная недвижимость | 131 | | |
| предметы финансовой аренды (лизинга) | 132 | | |
| прочие доходные вложения в материальные активы | 133 | - | - |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | - | - |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 38 656 | 2 |
| Отложенные налоговые активы | 160 | - | - |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 170 | - | - |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | - | - |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **52 530** | **14 508** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 7 537 | 6 505 |
| В том числе: материалы | 211 | 434 | 479 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | - | - |
| незавершенное производство | 213 | - | - |
| готовая продукция и товары | 214 | 7 103 | 6 026 |
| товары отгруженные | 215 | - | - |
| прочие запасы | 216 | - | - |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 220 | - | - |
| Расходы будущих периодов | 230 | 49 | 32 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 8 | - |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 12 794 | 9 627 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | - | - |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 1 338 | 1 118 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | - | - |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **21 726** | **17 282** |
| **БАЛАНС** | **300** | **74 256** | **31 790** |
| **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | **Код строки** | **На 31 декабря 2015 года** | **На 31 декабря 2014 года** |
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 100 | 100 |
| Неоплаченная часть уставного капитала | 420 | - | - |
| Собственные акции (доли в уставном капитале) | 430 | - | - |
| Резервный капитал | 440 | - | - |
| Добавочный капитал | 450 | 13 370 | 13 370 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 4 208 | 700 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | - | - |
| Целевое финансирование | 480 | - | - |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **17 678** | **14 170** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 40 837 | - |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | - | - |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | 41 | 49 |
| Доходы будущих периодов | 540 | - | - |
| Резервы предстоящих платежей | 550 | - | - |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | - | - |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **40 878** | **49** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 859 | 2 247 |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | - | - |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 14 677 | 15 160 |
| В том числе: | | | |
| поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 11 218 | 13 628 |
| по авансам полученным | 632 | 71 | 4 |
| по налогам и сборам | 633 | 1 029 | 211 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 394 | 386 |
| по оплате труда | 635 | 812 | 846 |
| по лизинговым платежам | 636 | - | - |
| собственнику имущества (учредителям, участникам) | 637 | 36 | 44 |
| прочим кредиторам | 638 | 1 117 | 41 |
| Обязательства, предназначенные для реализации | 640 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 650 | - | - |
| Резервы предстоящих платежей | 660 | 164 | 164 |
| Прочие краткосрочные обязательства | 670 | - | - |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **15 700** | **17 571** |
| **БАЛАНС** | **700** | **74 256** | **31 790** |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь–декабрь 2015 года

| Наименование показателей | Код строки | За январь–декабрь 2015 года | За январь–декабрь 2014 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 122 990 | 131 504 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (88 184) | (98 330) |
| Валовая прибыль (010 – 020) | 030 | 34 806 | 33 174 |
| Управленческие расходы | 040 | - | - |
| Расходы на реализацию | 050 | (31 821) | (32 073) |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030 – 040 – 050) | 060 | 2 985 | 1 101 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 36 554 | 735 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (33 412) | (366) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности (± 060 + 070 – 080) | 090 | 6 127 | 1 470 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 6 921 | 59 |
| В том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | - | 59 |
| доходы от участия в уставном капитале других организаций | 102 | - | - |
| проценты к получению | 103 | 6 921 | - |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 104 | - | - |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | - | (189) |
| В том числе: расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | - | (189) |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 112 | - | - |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 3 820 | - |
| В том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | 3 820 | - |
| прочие доходы по финансовой деятельности | 122 | - | - |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | (13 359) | (117) |
| В том числе: проценты к уплате | 131 | (1 429) | (117) |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | (11 897) | - |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 133 | (33) | - |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности (100 - 110 + 120 - 130) | 140 | (2 618) | (247) |
| Прибыль (убыток) до налогообложения (± 090 ± 140) | 150 | 3 509 | 1 223 |
| Налог на прибыль | 160 | - | (275) |
| Изменение отложенных налоговых активов | 170 | - | - |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 180 | 7 | (50) |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 190 | - | - |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | - | - |
| Чистая прибыль (убыток) (± 150 – 160 ± 170 ± 180 – 190 – 200) | 210 | 3 516 | 898 |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | - | - |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 230 | - | - |
| Совокупная прибыль (убыток) (± 210 ± 220 ± 230) | 240 | 3 516 | 898 |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию | 250 | - | - |
| Разводненная прибыль (убыток) на акцию | 260 | - | - |

Руководитель Рябенков Ю.С.
Главный бухгалтер Зеленская Н.Н.

# Ад зямлі да неба

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Хрыстос уваскрэс!

Гэтая ратавальная вестка — сведчанне трыумфу жыцця вечнага, перамогі над смерцю і тленнем. Мы радасна сустракаем Светлае Хрыстова Уваскрэсенне, праслаўляючы Уваскрэслага Хрыста, Жыццядаўца, ускладаючы на Яго ўсё сваё спадзяванне.

Святейшы Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Кірыл у адной са сваіх пропаведзяў падкрэсліў, што сёння нямала людзей «імкнецца зразумець сапраўдны сэнс быцця, знайсці шлях да Бога...». Каб добрая вестка дасягнула і іх, «голас Царквы павінен гучаць гучна і пераканаўча, дзеля сведчання пра Таго, *«Які аддадзены быў за грахі нашы і ўваскрэс для апраўдання нашага»* (Рым. 4: 25)». Несучы сведчанне пра Хрыста Уваскрэслага і памятаючы словы апостала: **«Калі вы ўваскрэслі з Хрыстом, то шукайце вышняга, дзе Хрыстос сядзіць праваруч Бога»** (Кал. 3: 1), падтрымаем адзін аднаго, каб ніхто не адчуваў сябе адзінокім, прыніжаным і безнадзейным. Падзелімся з усімі блізкімі і далёкімі радасцю аб Уваскрэслым Спасіцелю, радасцю магчымасці яднання з Ім. І тады і ў нас саміх, і ў навакольным свеце мы ўбачым змены да лепшага.

Сёння гэта надзвычай неабходна, таму што ў шэрагу краін хрысціяне перажываюць ганенні, параўнальныя з тымі, што былі ў ранні вякі хрысціянства, а часта і большыя за іх. «Руская Праваслаўная Царква з болем успрымае гэтую бяду, — кажа яе прадстаяцель. — Калі падзеі і далей будуць развівацца ў падобным рэчышчы, то сляды прысутнасці хрысціянства могуць практычна знікнуць там, дзе яно калісьці зарадзілася і існуе ўжо два тысячагоддзі... Як браты па веры, мы павінны падтрымліваць адзін аднаго ў цяжкі момант, узвышаць свой голас як адзіная Святая Саборная і Апостальская Царква». Няхай уваскрэсне Бог у сэрцах людзей, і няхай рассеюцца нянавісць і злосць, варожасць і сваркі, усялякія раздзяленні! **«Няхай усе будуць адно: як Ты, Ойча, ува Мне, і Я ў Табе, так няхай і яны ў Нас будуць адно»** (Ін. 17: 21).

Праасвяшчэнныя архіпастыры, узлюбленыя айцы, браты і сёстры! Будзем жа бясконца дзякаваць Богу за тыя дары, якія мы атрымалі праз прышэсце ў свет Яго Адзінароднага Сына. Няхай Пасхальны трыумф заўсёды жыве ў нашых душах і сэрцах і жывіць іх, няхай гэтай бясконцай радасцю напаўняецца і пранікаецца ўсё наша жыццё. Дабрадатная дапамога Божая няхай садзейнічае кожнаму з нас у далейшай працы на славу нашай Царквы, на славу нашай зямной Бацькаўшчыны, на дабро ўсім, хто мае патрэбу ў нашай увазе і клопаце.

Віншую ўсіх вас са святам Святой Пасхі Хрыстовай і маліцоўна зычу вам і вашым блізкім светлай пасхальнай радасці, усёпераможнай надзеі, моцы душэўных і цялесных сіл!

Хрыстос уваскрэс!

Сапраўды ўваскрэс Хрыстос!

**Павел,**
**мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі,**
**Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі**

## ■ Даслоўна

# ГІСТОРЫЮ ТРЭБА БЕРАГЧЫ

**Усё часцей мы вымушаны адстойваць сваю гісторыю, яшчэ раз даказваць даўно вядомыя ісціны, рабіць усё дзеля таго, каб не дапусціць скажэння падзей Другой сусветнай вайны, рэабілітацыі фашызму і прыніжэння ролі савецкага народа ў Вялікай Перамозе. Такой пазіцыі прытрымліваюцца і ўдзельнікі міжнароднага форуму пераможцаў «Вялікая Перамога, здабытая адзінствам», які ўпершыню адбыўся ў Мінску.**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Анатоль ІКСАНАЎ, выканаўчы дырэктар Міждзяржаўнага фонду гуманітарнага супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц краін СНД:**

— Назва форуму красамоўная. Сапраўды, перамагчы ў тую страшную вайну, якую забываць нельга, мы маглі толькі разам. Калі б паасобку, не было б ні незалежнай Беларусі, ні Расіі, ні Арменіі... Перамогу над фашызмам здабывалі ўсім светам. Не цана, перш за ўсё, заключалася ў тым, што пацярпела кожная сям'я. І варта ў XXI стагоддзі нагадваць, чаго чалавецтву каштавала гэтая катастрофа — Другая сусветная вайна.

На жаль, сёння многія працэсы палітызаваны, і пад палітычныя праблемы пачынаюць «падцягваць» і псеўдагісторыю — з тым, каб перагледзець і вынік Вялікай Перамогі. Для мяне самая галоўная праблема заключаецца ў тым, каб маладыя вучоныя, якія прыходзяць у гістарычную навуку, мелі правільныя арыенціры. Важна, каб маладзь розных краін працягвала кантактаваць, каб у будучыні разам вырашаць агульныя праблемы.

**Тарас ГАГНІДЗЭ, старшыня арганізацыі «Гістарычная спадчына» (Грузія):**

— Тое, што гісторыю, асабліва савецкага часу, перапісваюць, выкладаюць на свой лад, а пэўныя таварышы прыстасоўваюць яе пад свае кан'юнктурныя інтарэсы, у большай ступені актуальна для Грузіі, чым для Беларусі. У нашай краіне ветэранаў падтрымліваюць вельмі сціпла.

Яны атрымліваюць невялікую пенсію, ніякіх сацыяльных ільгот у іх няма. Трэба аддаць належнае новай уладзе, якая ў апошні час пачала звяртаць увагу на ветэранаў, але гэта кропля ў моры ў параўнанні з тым, чаго заслугоўваюць гэтыя паважаныя людзі. Падобныя форумы — як глыток паветра для іх, як сонейка ў цяжкі воблачны восеньскі дзень.

**Палад БЮЛЬБЮЛЬ аглы, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Азербайджанскай Рэспублікі ў Расійскай Федэрацыі, старшыня праўлення Міждзяржаўнага фонду гуманітарнага супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц краін СНД:**

— У Азербайджане з вялікай павагай адносяцца да гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Калі яна пачалася, у краіне пражывала каля 5 мільёнаў насельніцтва. 660 тысяч чалавек пайшлі на фронт, больш за 400 тысяч не вярнуліся дадому. Баку забяспечваў фронт нафтай, бензінам, алівай. Баку прымаў параненых, якія да нас ішлі з усіх франтоў. Баку ўнёс вельмі вялікі ўклад у Перамогу ў Вялікай Айчыннай вайне.

Сёння, калі мы жывём у розных краінах, у абсалютна іншай палітычнай абстаноўцы, кажучы сучаснай моваю, у іншым фармаце, вельмі важна памятаць пра тое, што зрабілі нашы бацькі і дзяды дзеля нашай свабоды, дзеля сённяшняга жыцця. Забываючы аб гэтым, мы перакрэсліваем цэлую вялізную трагічную і гераічную старонку краіны, у якой большасць з нас нарадзілася. І гэта было б абуральнай несправядлівасцю. Гісторыю трэба берагчы, паважаць. І недапушчальна, каб у XXI стагоддзі знішчаліся помнікі.

**Мікалай ГУЦУЛ, старшыня праўлення Славянскай праваахоўнай арганізацыі «Веча», аўтар кніг па ваеннанавуковай тэматыцы (Малдова):**

— Колькі я ўзначальваю арганізацыю, столькі ж Малдова займаецца пытаннямі аднаўлення і ўвекавечвання памяці. 7 мая мы адкрываем 70-ты аднаўлены воінскі помнік. Тым не менш сітуацыя ў Рэспубліцы Малдова вельмі няпростая. У нас нават няма падручніка па гісторыі Малдовы. Нашы школьнікі вывучаюць гісторыю Румыніі. Там, вядома, не адлюстравана роля Чырвонай Арміі ў Вялікай Айчыннай вайне, у тым ліку малдаўскіх салдат, якія ўнеслі свой уклад у Вялікую Перамогу над фашызмам. А ў асноўным падкрэсліваецца, што Малдова, Бесарабія была акупавана таталітарным камуністычным рэжымам. Мы павінны ўнесці кардынальныя змены ў сваю літаратуру, каб у нас была ўласная гісторыя малдаўскага народа.

**Аляксандр ЧАЧЫЯ, кіраўнік Цэнтра праблем глабалізацыі, акадэмік Расійскай акадэміі сацыяльных навук, доктар палітычных навук, прафесар:**

— Хлусілвыя абвінавачванні супраць нашых бацькоў і дзядоў, якія яшчэ працягваюць вяшчаць з тэлеэкранаў ліберальныя палітыкі, псеўдагісторыкі і купленыя журналісты, павісаюць у паветры. Грамадства адмаўляецца іх прымаць. Адыгрывае сваю ратавальную ролю інстынкт нацыянальнага самазахавання. Людзі разумеюць, што, змешваючы з гразззю сваё мінулае, адмаўляючы светлую памяць сваіх бацькоў і дзядоў, яны парушаюць натуральны ход гісторыі, парываюць жывую сувязь часоў і пакаленняў.

А адмаўленне ад пераемнасці пакаленняў азначае гібель нацыі. Вайна, якая знявечыла нашу культуру, гісторыю, традыцыі, нашу духоўнасць і мараль, не скончылася ў 1945 годзе. Яна працягваецца і сёння. Іншымі формамі, метадамі, але сутнасць не мяняецца. Галоўнае для пэўных сіл — не дапусціць адзінства нашых народаў, бо гістарычны вопыт паказаў: калі мы разам, мы можам усё. І звышдзяржаву пабудаваць, і ў сусветнай вайне перамагчы, і космас заваяваць.

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*


# ООО «Глера Тау»

Учетный номер плательщика: 291044757
Вид экономической деятельности:
Сдача внаем собственного недвижимого имущества
Организационно-правовая форма: Общество с ограниченной ответственностью
Орган управления: Юридическое лицо без вневедомственного подчинения
Единица измерения: млн руб.
Адрес: 224024, г. Брест, ул. Шоссейная, 2, пом. 11

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 31 декабря 2015 года**

| АКТИВЫ | Код строки | На 31 декабря 2015 года | На 31 декабря 2014 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 24 763 | 23 121 |
| Нематериальные активы | 120 | - | - |
| Доходные вложения в материальные активы | 130 | - | - |
| В том числе: инвестиционная недвижимость | 131 | | |
| предметы финансовой аренды (лизинга) | 132 | | |
| прочие доходные вложения в материальные активы | 133 | - | - |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | - | 2 348 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | - | 7 063 |
| Отложенные налоговые активы | 160 | - | - |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 170 | - | - |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | 5 425 | - |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **30 188** | **32 532** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | - | - |
| В том числе: материалы | 211 | - | - |
| животные на выращивании и откорме | 212 | - | - |
| незавершенное производство | 213 | - | - |
| готовая продукция и товары | 214 | - | - |
| товары отгруженные | 215 | - | - |
| прочие запасы | 216 | - | - |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 220 | - | - |
| Расходы будущих периодов | 230 | 11 | - |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | | 1 866 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 20 212 | 4 721 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | - | - |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 1 | - |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | - | - |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **20 224** | **6 587** |
| **БАЛАНС** | **300** | **50 412** | **39 119** |
| **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | **Код строки** | **На 31 декабря 2015 года** | **На 31 декабря 2014 года** |
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 168 | 99 |
| Неоплаченная часть уставного капитала | 420 | - | - |
| Собственные акции (доли в уставном капитале) | 430 | - | - |
| Резервный капитал | 440 | - | 69 |
| Добавочный капитал | 450 | - | - |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 179 | 124 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | | - |
| Целевое финансирование | 480 | - | - |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **347** | **292** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 47 683 | 35 089 |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | - | - |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 540 | - | - |
| Резервы предстоящих платежей | 550 | - | - |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | | 222 |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **47 683** | **35 311** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | - | - |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | | - |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 2 382 | 3 516 |
| В том числе: | | | |
| поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 809 | 2 007 |
| по авансам полученным | 632 | 714 | - |
| по налогам и сборам | 633 | - | 5 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | - | - |
| по оплате труда | 635 | - | - |
| по лизинговым платежам | 636 | - | - |
| собственнику имущества (учредителям, участникам) | 637 | - | - |
| прочим кредиторам | 638 | 859 | 1 504 |
| Обязательства, предназначенные для реализации | 640 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 650 | | - |
| Резервы предстоящих платежей | 660 | - | - |
| Прочие краткосрочные обязательства | 670 | - | - |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **2 382** | **3 516** |
| **БАЛАНС** | **700** | **50 412** | **39 119** |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ**
**за январь–декабрь 2015 года**

| Наименование показателей | Код строки | За январь–декабрь 2015 года | За январь–декабрь 2014 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 5 461 | 2 272 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (1 327) | - |
| Валовая прибыль (010 – 020) | 030 | 4 134 | 2 272 |
| Управленческие расходы | 040 | (86) | (516) |
| Расходы на реализацию | 050 | - | - |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030 – 040 – 050) | 060 | 4 048 | 1 756 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 169 | - |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (325) | (1 014) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности (± 060 + 070 – 080) | 090 | 3 892 | 742 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 69 693 | 180 |
| В том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | 60 782 | - |
| доходы от участия в уставном капитале других организаций | 102 | - | - |
| проценты к получению | 103 | 8 911 | - |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 104 | - | 180 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | (65 336) | (266) |
| В том числе: расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | (65 336) | - |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 112 | - | (266) |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 4 548 | 1 239 |
| В том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | 3 976 | 22 |
| прочие доходы по финансовой деятельности | 122 | 572 | 1 217 |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | (12 708) | (1 820) |
| В том числе: проценты к уплате | 131 | (80) | - |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | (12 532) | (1 415) |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 133 | (96) | (405) |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности (100 - 110 + 120 - 130) | 140 | (3 803) | (667) |
| Прибыль (убыток) до налогообложения (± 090 ± 140) | 150 | 89 | 75 |
| Налог на прибыль | 160 | - | - |
| Изменение отложенных налоговых активов | 170 | - | - |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 180 | - | - |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 190 | - | - |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | | - |
| Чистая прибыль (убыток) (± 150 – 160 ± 170 ± 180 – 190 – 200) | 210 | 89 | 75 |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | - | - |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 230 | - | - |
| Совокупная прибыль (убыток) (± 210 ± 220 ± 230) | 240 | 89 | 75 |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию | 250 | - | - |
| Разводненная прибыль (убыток) на акцию | 260 | - | - |

Руководитель Прохоров В.В.
Главный бухгалтер Боднар Е.В.

# ДАНІНА МОДЗЕ ЦІ БУДУЧЫНІ?

## Рэктар БДУ — пра «воблачныя тэхналогіі», анлайн-навучанне і гейміфікацыю адукацыі



**На нядаўнім міжнародным спецыялізаваным форуме ТІВО-2016 інтэрнэт-партал Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта заняў першае месца ў намінацыі «Адукацыя і навука». У апошняй рэдакцыі Сусветнага рэйтынгу ўніверсітэтаў Webometrics Ranking of World Universities Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт увайшоў у тройку лепшых універсітэтаў СНД. Вышэйшыя навучальныя ўстановы ранжыруюцца ў гэтым рэйтынгу па паказчыках, якія характарызуюць прысутнасць універсітэта ў сусветнай інтэрнэт-прасторы. А электронная бібліятэка БДУ ў апошнім рэйтынгу Ranking Web of World Repositories размясцілася на сотым месцы сярод бібліятэк універсітэтаў свету і заняла другое месца ў рэйтынгу бібліятэк краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы.**
**Пра сусветныя трэнды ў інфарматызацыі адукацыі і «падводныя камяні» электроннага навучання мы гутарым з рэктарам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, акадэмікам Сяргеем АБЛАМЕЙКАМ.**

### У рэчышчы сусветных тэндэнцый

***— Сяргей Уладзіміравіч, у 2013 годзе ў БДУ была распрацаваная Канцэпцыя інфарматызацыі з разлікам на пяць бліжэйшых гадоў. Наколькі далёка ўдалося прасунуцца ў яе рэалізацыі?***

— Пашырэнне прадстаўніцтва БДУ ў інтэрнэце — якраз адна з задач, прапісаных у нашай канцэпцыі, і мы з ёй, мяркую, паспяхова спраўляемся.

На сённяшні дзень у БДУ створана сучасная тэлекамунікацыйная інфраструктура. Агульная працягласць оптавалаконных магістраляў дасягае 50 кіламетраў! Навучальныя і адміністрацыйныя карпусы ўніверсітэта, а таксама студэнцкія інтэрнаты, аб'яднаныя ў адзіную карпаратыўную сетку. Ва ўсіх навучальных і адміністрацыйных карпусах БДУ дзейнічаюць кропкі Wi-Fi. Пашыраны прапускныя здольнасці знешніх каналаў, прадугледжаны дадатковыя метады сеткавай бяспекі з улікам масавага падключэння да сеткі мабільных прылад студэнтаў і супрацоўнікаў.

Адзін са стратэгічных напрамкаў — развіццё «воблачных тэхналогій»: прымяненне апошніх гарантуе мабільнасць і актуальнасць адукацыйных рэсурсаў, зніжэнне выдаткаў на інфарматызацыю і магчымасць забяспечыць высокі ўзровень бяспекі інфармацыі.

«Воблачныя тэхналогіі» дазволяць студэнтам працаваць з праграмным забеспячэннем віртуальнай лабараторыі з любых камп'ютараў як у карпаратыўнай сетцы БДУ, так і дома, праз інтэрнэт, не ўсталёўваючы на гэтыя камп'ютары спецыяльнае праграмнае забеспячэнне.

Стварэнне адукацыйнага мультымедыйнага кантэнту (відэазапісаў лекцый, лабараторных дэманстрацый, запісаў відэаканферэнцый, навучальных відэаролікаў і г.д) — прыярытэтная задача інфарматызацыі ў БДУ. Для доступу да мультымедыйнага кантэнту ў найбліжэйшы час павінна быць укаранёная сістэма «відэа па запыце».

Паставіўшы задачу максімальнага ўключэння ў адукацыйны працэс асабістых персанальных камп'ютараў і камп'ютарных прылад, універсітэт перагледзеў тыпавыя канфігурацыі камп'ютарных класаў, якія функцыянуюць у «воблачнай» сістэме. Мы лічым, што колькасць камп'ютараў у большасці класаў можа быць скарочана да 40-50% ад колькасці студэнтаў. Астатнія ж працоўныя месцы будуць абсталёўвацца зручнымі (праваднымі або бесправаднымі) сродкамі доступу ў сетку БДУ для падключэння асабістых мабільных камп'ютараў нашых студэнтаў.

### Стэнфард і Прынстан становяцца бліжэй

***— Цягам апошніх дваццаці гадоў сродкі навучання моцна эвалюцыянавалі. І сёння для таго, каб навучацца, зусім неабавязкова наведваць лекцыі. Тая ж інтэрнэт-акадэмія Хана прадастаўляе бясплатны доступ да больш чым 4 тысяч мікралекцый па самых розных дысцыплінах...***

— У Злучаных Штатах Амерыкі, краінах Заходняй Еўропы, Паўднёва-Усходняй Азіі, а з нядаўняга часу і ў Расіі выразна акрэслілася новая тэндэнцыя — кааперацыя вядучых ВНУ для аб'яднання электроннага кантэнту і пераход да канцэпцыі адкрытага навучання. У чым яе сутнасць? Адкрытая адукацыя даступная фактычна любому ахвотнаму, незалежна ад яго зыходнага ўзроўню ведаў: яна выкарыстоўвае тэхналогіі і методыкі навучання на адлегласці і забяспечвае навучанне ў зручным рэжыме. Па сутнасці, адкрытая адукацыя рэалізуе патрэбы асобы ў бесперапыннай адукацыі, якія дыктуюцца сучасным грамадствам. Як правіла, адкрытая адукацыя развіваецца кансорцыумамі навучальных устаноў. Напрыклад, слухачамі вядомага праекта ў сферы масавай анлайн-адукацыі Coursera з'яўляюцца больш як 10 мільёнаў чалавек, якія вывучаюць каля 1000 курсаў ад больш чым 100 універсітэтаў. Сярод іх Стэнфард, Прынстан, Мічыганскі і Пенсільванскі ўніверсітэты...

Выгады, якія спрабуюць атрымаць удзельнікі найбуйнейшых кансорцыумаў адкрытай адукацыі, зусім не зводзяцца да імгненнага вяртання інвестыцый і неадкладнага атрымання прыбытку. Фактычна мы назіраем барацьбу за «месца пад сонцам» ва ўмовах, калі праз 10-15 гадоў анлайн-навучанне (як мінімум на ўзроўнях вышэйшай і дадатковай адукацыі) стане дамінуючым, а забяспечваць адукацыйны працэс ва ўмовах усеагульнай глабалізацыі будуць усяго некалькі сотняў (максімум — тысяч) універсітэтаў.

### Чаму студэнты замаўкаюць?

***— Няўжо дыстанцыйнае навучанне можа цалкам выцесніць з вышэйшай школы прафесара з крэйдай? І ўвогуле, ці не лічыце вы, што ўкараненне інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій у навучальны працэс прынясе больш шкоды, чым карысці?***

— У чымсьці вы маеце рацыю. Паўсюднае выкарыстанне інфармацыйных і камунікацыйных тэхналогій прыводзіць да згортвання сацыяльных кантактаў. Найбольшыя цяжкасці для студэнтаў заўсёды ўяўляў пераход ад тэорыі да практыкі. На псіхалагічнай мове гэта праблема пераходу ад думкі да дзеяння. А пастаяннае ўзаемадзеянне з камп'ютарам можа толькі дадаткова ўскладняць такі пераход.

Пэўныя негатыўныя моманты ўзнікаюць ужо падчас выкарыстання сучасных пошукава-навігацыйных сістэм. Гэта звязана са свабодай, якой не так проста распараджацца. Нелінейная структура знойдзенай інфармацыі падвяргае студэнта спакусе ісці ўслед за прапанаванымі спасылкамі. Пры няўмелым выкарыстанні гэта можа адцягнуць яго ад асноўнага рэчышча выкладання вучэбнага матэрыялу. Другая прычына — лішак інфармацыі, «інфармацыйны шум» або «інфармацыйнае смецце», якія суправаджаюць практычна любы запыт у інтэрнэце. І, як наступства, у студэнтаў фарміруецца мазаічнае мысленне.

Развіццё сістэм мультымедыя спарадзіла багацце інфармацыйных прадуктаў, «нашпігаваных» самымі рознымі відамі інфармацыі. Праблем тут дзве. Па-першае, кароткачасовая памяць чалавека валодае вельмі абмежаванымі магчымасцямі. Таму, калі студэнту адначасова паказваюць тэкст, які за кадрам агучваецца, тут жа дэманструюць анімацыйныя эфекты і пару малюнкаў, яго ўвага адцягваецца ад адных тыпаў інфармацыі, каб усачыць за іншымі, і студэнт прапускае важныя звесткі. Па-другое, мы ўсе адрозніваемся спосабамі ўспрымання інфармацыі. У залежнасці ад таго, якое паўшар'е мозга ў чалавека — вядучае, ён лепш успрымае або вобразы, або логіку выкладання. А калі ў адным слайдзе прэзентацыі спалучаецца і тое, і іншае, пакутуюць усе.

Да таго ж вучэбны дыялог студэнта і камп'ютара вельмі абмежаваны па сваёй логіцы. Як следства, складана арганізаваны навучальны матэрыял пачынае крышыцца на дробныя фрагменты, што не заўсёды апраўдана. Да таго ж пры пастаяннай працы на камп'ютары студэнт замаўкае. Орган аб'ектывізацыі мыслення чалавека — гаворка — аказваецца выключаным на працягу ўсіх гадоў навучання. Гэта асабліва характэрна для студэнтаў, якія навучаюцца дыстанцыйна. Але ёсць і несумненныя плюсы — гэта мабільнасць адукацыі. Доступ да інфармацыі і адукацыйных паслуг цяпер пастаянны — незалежна ад часу і месца знаходжання.

Як правіла, мабільнае навучанне абапіраецца на «воблачныя тэхналогіі», якія дазваляюць хутка актуалізаваць адукацыйны кантэнт, у тым ліку, з улікам аналізу паводзінаў і патрэбаў студэнтаў. Прычым эластычнасць «воблачных тэхналогій» дазваляе студэнту атрымліваць толькі неабходны яму аб'ём інфармацыі. Мабільныя і «воблачныя тэхналогіі» — галоўная платформа для развіцця адкрытай адукацыі.

### Вучоба ў сацыяльных сетках

***— А як вы ацэньваеце адукацыйны патэнцыял сацыяльных сетак?***

— Сацыяльныя сеткавыя сэрвісы — сфера інфарматызацыі грамадства, якая развіваецца найбольш дынамічна. Яны прадастаўляюць карыстальнікам віртуальныя пляцоўкі, якія злучаюць людзей у сеткавыя супольнасці з дапамогай камп'ютараў і прылад з доступам у інтэрнэт. Пры гэтым не варта выпускаць з віду мэтазгоднасць стварэння для гэтых мэтаў спецыялізаваных прафесійных сетак (між іншым, такія сеткі ўжо створаны і паспяхова дзейнічаюць).

Выкарыстанне сацыяльных сеткавых сэрвісаў у адукацыйнай дзейнасці, як правіла, грунтуецца на самаарганізацыі актыўных студэнтаў альбо іх самаарганізацыі вакол актыўнага педагога. Яшчэ адзін адукацыйны трэнд — гейміфікацыя. Ён мае два асноўныя напрамкі. Першы — гэта атрыманне новых ведаў і кампетэнцый ў працэсе гульнявой дзейнасці. Другі, не менш важны напрамак гейміфікацыі, — унясенне элементаў спаборніцтва ў адукацыйны працэс і магчымасць параўнаць свае вынікі з вынікамі іншых удзельнікаў адукацыйнага працэсу. Нарэшце, нельга не згадаць і такую форму кааперацыі студэнтаў, як калектыўнае выкананне заданняў, праектаў у складзе віртуальных каманд, спаборніцтвы паміж гэтымі камандамі і гэтак далей.

***— І ўсё ж такі інфарматызацыя — даніна модзе ці за ёй будучыня?***

— Я ўпэўнены, што правільна арганізаванае інфармацыйнае асяроддзе павышае ўзровень актыўнасці студэнта, развівае ў яго альтэрнатыўнае мысленне, фарміруе ўменне распрацоўваць стратэгію пошуку рашэнняў як навучальных, так і практычных задач, прагназаваць вынікі сваёй дзейнасці. Таму інфарматызацыю адназначна трэба лічыць перспектыўным кірункам для мадэрнізацыі ўсёй сістэмы адукацыі

**Надзея НІКАЛАЕВА**
*nikalaeva@zviazda.by*

Общество с ограниченной ответственностью
**«Паритет Партнер»**
Учетный номер плательщика: 790310877
Вид экономической деятельности:
Сдача внаем собственного недвижимого имущества
Организационно-правовая форма: Общество с ограниченной ответственностью
Орган управления: Юридическое лицо без ведомственной подчиненности
Единица измерения: млн руб.
Адрес: 220082, г. Минск, ул. Матусевича, 20, пом. 31

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 31 декабря 2015 года**

| АКТИВЫ | Код строки | На 31 декабря 2015 года | На 31 декабря 2014 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | - | - |
| Нематериальные активы | 120 | 26 733 | 27 715 |
| Доходные вложения в материальные активы | 130 | - | - |
| В том числе: инвестиционная недвижимость | 131 | - | - |
| предметы финансовой аренды (лизинга) | 132 | - | - |
| прочие доходные вложения в материальные активы | 133 | - | - |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | - | - |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 7 072 | 7 852 |
| Отложенные налоговые активы | 160 | - | - |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 170 | - | - |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | - | - |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **33 805** | **35 567** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 664 | 856 |
| В том числе: материалы | 211 | 664 | 856 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | - | - |
| незавершенное производство | 213 | - | - |
| готовая продукция и товары | 214 | - | - |
| товары отгруженные | 215 | - | - |
| прочие запасы | 216 | - | - |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 220 | - | - |
| Расходы будущих периодов | 230 | 11 571 | 6 780 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 629 | 4 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 12 642 | 406 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | - | - |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 7 | - |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | - | - |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **25 513** | **8 046** |
| **БАЛАНС** | **300** | **59 318** | **43 613** |

| СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | Код строки | На 31 декабря 2015 года | На 31 декабря 2014 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 2 150 | 2 150 |
| Неоплаченная часть уставного капитала | 420 | - | - |
| Собственные акции (доли в уставном капитале) | 430 | - | - |
| Резервный капитал | 440 | 47 | 47 |
| Добавочный капитал | 450 | 5 563 | 5 563 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 15 599 | 15 598 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | - | - |
| Целевое финансирование | 480 | - | - |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **23 359** | **23 358** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 2 374 | 19 049 |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | - | - |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 540 | - | - |
| Резервы предстоящих платежей | 550 | - | - |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | - | - |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **2 374** | **19 049** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | - | - |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | - | - |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 33 572 | 1 193 |
| В том числе: | | - | - |
| поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 1 | 138 |
| по авансам полученным | 632 | 33 566 | 1 052 |
| по налогам и сборам | 633 | 2 | - |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 1 | 2 |
| по оплате труда | 635 | 1 | 1 |
| по лизинговым платежам | 636 | - | - |
| собственнику имущества (учредителям, участникам) | 637 | - | - |
| прочим кредиторам | 638 | 1 | - |
| Обязательства, предназначенные для реализации | 640 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 650 | 13 | 13 |
| Резервы предстоящих платежей | 660 | - | - |
| Прочие краткосрочные обязательства | 670 | - | - |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **33 585** | **1 206** |
| **БАЛАНС** | **700** | **59 318** | **43 613** |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ**
**за январь–декабрь 2015 года**

| Наименование показателей | Код строки | За январь–декабрь 2015 года | За январь–декабрь 2014 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | - | 1 501 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | - | (199) |
| Валовая прибыль (010 – 020) | 030 | - | 1 302 |
| Управленческие расходы | 040 | - | (387) |
| Расходы на реализацию | 050 | - | - |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030 – 040 – 050) | 060 | - | 915 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 242 | 4 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (193) | (297) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности (± 060 + 070 – 080) | 090 | 49 | 622 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 780 | 21 |
| В том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | - | 1 |
| доходы от участия в уставном капитале других организаций | 102 | 780 | 20 |
| проценты к получению | 103 | - | - |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 104 | - | - |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | (788) | - |
| В том числе: расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | - | - |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 112 | (788) | - |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | - | 13 |
| В том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | - | 3 |
| прочие доходы по финансовой деятельности | 122 | - | 10 |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | (38) | (2) |
| В том числе: проценты к уплате | 131 | - | - |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | - | - |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 133 | (38) | (2) |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности (100 - 110 + 120 - 130) | 140 | (46) | 32 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения (± 090 ± 140) | 150 | 3 | 654 |
| Налог на прибыль | 160 | (2) | (3) |
| Изменение отложенных налоговых активов | 170 | - | - |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 180 | - | - |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 190 | - | - |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | - | - |
| Чистая прибыль (убыток) (± 150 – 160 ± 170 ± 180 – 190 – 200) | 210 | 1 | 651 |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | - | - |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 230 | - | - |
| Совокупная прибыль (убыток) (± 210 ± 220 ± 230) | 240 | 1 | 651 |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию | 250 | - | - |
| Разводненная прибыль (убыток) на акцию | 260 | - | - |

Руководитель Прохоров В.В.
Главный бухгалтер Кудрейко Н.В.

# РЭЙНДЖАРЫ АТАМНАЙ ЗОНЫ



**Тады, у складаным 1986-м, чарнобыльская трагедыя не пакінула ўбаку нікога. На барацьбу з наступствамі аварыі накіравалі многіх: выратавальнікаў, вайскоўцаў... За парадкам на дарогах пры адсяленні людзей сачылі супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі, іншыя міліцыянеры выконвалі свае абавязкі ў 30-кіламетровай зоне адсялення. Сярод камандзіраваных апынуўся і Уладзімір ГІЦКІ, наш сённяшні суразмоўца.**

## «РАДЗІМА ЗАГАДАЛА — ПАЕХАЎ»

— Службу ў міліцыі я пачынаў у крымінальным вышуку. Але папрацаваў там нядоўга. Генерал Генадзь Пукаў, тагачасны начальнік УУС Мінаблвыканкама, пачытаў асабістую справу, і мяне перавялі ў крымінальныя эксперты. І ўсю службу я правёў з фотакамерай у руках, — рэагуе на шчоўканне затвора фатографа Уладзімір Аляксандравіч, які выйшаў на пенсію ў званні палкоўніка міліцыі.

У зоне адсялення ў складзе зводнага атрада я апынуўся праз некалькі месяцаў пасля аварыі — у кастрычніку. Атрад складаўся з супрацоўнікаў упраўленняў унутраных спраў Брэсцкай і Мінскай абласцей. Атрымлівалася, што адзін міліцыянер у нарадзе быў з Брэста, а другі — з Мінска. Калі мы туды прыехалі, брастаўчане ўжо знаходзіліся там два тыдні і дапамагалі нам уваходзіць у курс спраў. Агулам у 30-кіламетровай зоне мы правілі месяц.

***— Ці была магчымасць адмовіцца ад падобнай камандзіроўкі?***

— А ў нас ніхто не пытаўся. Якраз летам у мяне нарадзілася дачка і ўжо праз некалькі месяцаў давялося з'ехаць. Жонка, магчыма, усцешана гэтым не была, аднак радзіма загадала — я паехаў.

***— Памятаеце, калі ўпершыню даведаліся пра аварыю?***

— Як і ўсе — праз некалькі дзён. Зразумела, першыя чуткі пайшлі раней. Аднак усё абмяркоўвалася на ўзроўні пагалосак, якіх было шмат. Цалкам усё стала вядома толькі пасля таго, як у прэсе з'явіліся першыя афіцыйныя паведамленні. Але панікі ўсё роўна не было. Людзі проста не ведалі, што насамрэч здарылася.

***— Вам не было страшна туды ехаць? Ад Нароўлі да Чарнобыля ўсяго сто з нечым кіламетраў.***

Я размаўляў са сваім таварышам, які быў там ужо праз два тыдні пасля выбуху. І тое, што ён мне распавёў, цалкам пацвердзілася. Розніца толькі ў тым, што ён дапамагаў людзям у адсяленні, а калі мы туды прыехалі, у вёсках ужо нікога не было. Па дарогах і вёсках блукалі здзічэлыя, галодныя сабакі, якія часам кідаліся на людзей, таму іх прыходзілася адстрэльваць. Але былі сабачкі, якія нават сябравалі з намі. На памяць у мяне захаваўся здымак, на якім я цісну аднаму з іх лапу. Той кастрычнік быў вельмі спякотным. Павырасталі ўсе сельскагаспадарчыя культуры. І ўбачыць у полі дзіка са сваім выводкам было даволі лёгка.

## «НАЧАВАЛІ Ў ПЕРААБСТАЛЯВАНЫХ ШКОЛЬНЫХ КЛАСАХ»

***— Якія абавязкі вы выконвалі?***

— Ахоўвалі парадак на тэрыторыі зоны, не дапускалі, каб чалавек патрапіў у забруджаную зону. Мы жылі ў Нараўлянскім раёне ў вёсцы Цешкаў. Начавалі ў пераабсталяваных школьных класах. Харчавацца нас вазілі на аўтобусе ў райцэнтр, да якога было прыкладна дваццаць кіламетраў. Што да нясення службы, у нас былі стацыянарныя пасты, што перакрывалі ўсе дарогі, пешыя патрулі, якія абыходзілі ўсе вёскі, мабільныя нарады...

***— Людзі не спрабавалі вярнуцца ў свае вёскі?***

— Наведваць 30-кіламетровую зону было цалкам забаронена. Усе перамяшчэнні мы павінны былі адсочваць. Хоць, безумоўна, людзі прыязджалі, прасіліся, каб ім дазволілі забраць з хат дакументы, рэчы, грошы з хованкі. Да падобнага мы ставіліся па-чалавечы. Людзей у дом пускалі, а пасля зноў апячатвалі дзверы.

***— З марадзёрствам сутыкаліся?***

— Так, мы нават затрымалі украінцаў, якія ў адным з населеных пунктаў разбіралі хлеў, грузілі ўсё на трактар і спрабавалі яго кудысьці звезці. Дапускаю, што ў зоне маглі быць і браканьеры, але з імі мы не сутыкаліся. Вудзіць рыбу забаранялася. Яе было з лішкам, але ўсё навокал — забруджанае.

## «НАШ АЎТОБУС МЫЛІ Ў ЯМЕ З ВАДОЙ І СПЕЦЫЯЛЬНЫМ РАСТВОРАМ»

***— У пакінутых хатах панаваў беспарадак?***

— Не, у многіх дамах было чыста, прыбрана. Склалася ўражанне, што людзі загадзя рыхтаваліся да адсялення і спакойна збіраліся. Трэба дадаць, што ў дом мы маглі заходзіць толькі ў тым выпадку, калі была сарвана пячатка. У такім разе мы яго апячатвалі нанова.

***— Вы на сабе адчувалі прысутнасць радыяцыі?***

— Аднойчы, калі падзьмуў моцны-моцны вецер, адчуў у роце горыч, сухасць. Для асабістай бяспекі мы павінны былі насіць рэспіратары. Але як гэта магчыма ў такую спёку?! Нягледзячы на гэта, мы дакладна выконвалі інструкцыі, і праблем са здароўем ніхто не адчуваў. Пасля кожнага выезду мы мусілі з шланга мыць машыну. Аўтобус, на якім нас вазілі ў сталоўку, мылі ў спецыяльнай яме, напоўненай вадой і растворам. Пасля патрулявання ўсе штодня абавязкова хадзілі ў лазню. Усю форму трымалі ў асобным памяшканні. Пасля таго, як мы з'ехалі дадому, яе, зразумела, знішчылі. Нам таксама забаранялася адхіляцца ад маршруту, каб не агалілі ўчастак, на якім можна было патрапіць у зону.

***— На харчаванне не скардзіліся?***

— Калі мы былі на службе, нам выдавалі даволі добры сухі паёк: тушонку, селядзец івасі, паштэты, мінеральную ваду. Кармілі пастаянна ў сталоўцы, у Нароўлі.

***— Як адчувалі сябе ў час камандзіроўкі?***

— Я не сказаў бы, што адчуваў у той час упадак сіл, галаўны боль. Ды і было мне тады не 61 год, як зараз. Арганізм быў моцны. У нас у атрадзе наогул ніхто не скардзіўся на самаадчуванне. Колькі нас прыехала ў зону, столькі вярнулася дадому. Хоць цяпер шэрагі таварышаў ужо парадзелі. Многія пайшлі з жыцця.

***— Уладзімір Аляксандравіч, а ці вярталіся пасля ў Цешкаў?***

— Патрапіць туды праблема. Гэта па-ранейшаму зона адчужэння. Хоць у многіх былых выселеных вёсках ужо зноў дазволілі жыць, апрацоўваць палі. Праз 15 гадоў пасля аварыі я праз Нараўлянскі раён ехаў у Адэсу. Праязджаў тыя мясціны, дзе калісьці нёс службу. Сэрца, вядома, сціскалася.

***— Тэма Чарнобыля вас і сёння цікавіць?***

— Так. Я ведаю, што многія самастойна ездзяць у чарнобыльскую зону, а пасля выкладваюць у сеціве ролікі. І мне часам бывае цікава паглядзець відэа, даведацца, што сталася з тымі вёскамі. Мяркую, захавалася там няшмат.

**Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.**

### Ігар ШУНЕВІЧ, міністр унутраных спраў Беларусі:

— 26 красавіка 1986 года трагедыя ў Чарнобылі, якая ўвайшла ў гісторыю як самая страшная тэхнагенная катастрофа мінулага стагоддзя, чорным крылом накрыла нашу сінявокую Беларусь. На ліквідацыю наступстваў аварыі хутка былі накіраваны супрацоўнікі многіх міліцэйскіх падраздзяленняў рэспублікі. Яны паспяхова спраўляліся з арганізацыяй ачаплення, эвакуацыяй насельніцтва, патруляваннем, падтрымкай грамадскага парадку ў зонах адсялення і адчужэння. Зводныя атрады дзейнічалі самаадданна, годна і мужна, не пахіснуліся перад небяспекай. У той момант наўрад ці нехта думаў, што выкананне прафесійнага абавязку пазней будзе лічыцца подзвігам. Ведалі адно: патрэбны неверагодныя высілкі, каб уціхамірыць «мірны» атам. Кожны на сваім участку імкнуўся зрабіць усё магчымае, а часам і немагчымае для агульнай бяспекі.

Пазаштатная сітуацыя падрывала здароўе людзей. Многія атрымалі разнастайныя дозы апраменьвання, адмаўляліся ад шпіталізацыі і працягвалі выконваць свае абавязкі, не звярталі ўвагі на прысмак жалеза ў роце, пяршэнне ў горле, галаўны боль. У самыя гарачыя месяцы пасля катастрофы ў іх не было часу на сябе і свае ўнутраныя адчуванні, бо слова «абавязак», «свядомасць», «загад» былі не пустым гукам. Сёння многіх ужо няма ў нашых шэрагах. Аднак мы памятаем пра іх і ніколі не забудзем, бо коштам сваіх жыццяў яны ратавалі нашы.

■ З нагоды

# ПА ПОКЛІЧУ СЭРЦА

## Супрацоўнікі Міністэрства ўнутраных спраў узялі ўдзел у мерапрыемствах, прысвечаных 30-й гадавіне аварыі на Чарнобыльскай АЭС

**26 красавіка ў праваслаўным храме-помніку ў гонар абраза Маці Божай "Адшуканне загінулых", што ў Мінску, адбылася жалобная цырымонія. Па традыцыі ў ёй удзельнічалі супрацоўнікі розных падраздзяленняў органаў унутраных спраў, ветэраны-ліквідатары і прадстаўнікі грамадскасці.**



Крыху пазней у парку Дружбы народаў ветэраны МУС сумесна з прадстаўнікамі органаў дзяржуправлення ўсклалі кветкі да памятных знакаў «Ахвярам Чарнобыля» і «Камень міру Хірасімы». У сваю чаргу Ігар Шуневіч, міністр унутраных спраў, сустрэўся з міліцыянерамі-ліквідатарамі. Сярод іх былі і камандзіры першых зводных атрадаў МУС, што падтрымлівалі парадак у зоне адсялення. Ветэранам уручылі ўрадавыя і ведамасныя ўзнагароды, паказалі тэматычны фільм. Адбыўся канцэрт-рэквіем.

У рамках міліцэйскай акцыі «Па абавязку службы і поклічы сэрца», якая прайшла па ўсёй тэрыторыі краіны, ушаноўвалі і тых, каго ўжо няма з намі. Міністэрства таксама стараецца дапамагаць у рашэнні матэрыяльна-бытавых і іншых праблем пенсіянераў і інвалідаў тэхнагеннай катастрофы.

Як паведамілі ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС, у ліквідацыі аварыі і яе наступстваў узяло ўдзел больш як 11 тысяч супрацоўнікаў беларускай міліцыі і вайскоўцаў унутраных войск. З першых дзён аварыі намаганні зводных атрадаў міліцыі былі скіраваны на



аказанне дапамогі мясцовым жыхарам, садзейнічанне мясцовай выканаўчай уладзе пры адсяленні насельніцтва з забруджаных тэрыторый, супрацьстаянне марадзёрам, зладзеям ■

■ Сітуацыя

# ЦІ ПАТРЭБНЫ РОВАРУ «ЧУЖЫЯ» НОГІ?

**Надышла вясна, а з ёй на сталічных веладарожках з'явіліся сотні веласіпедыстаў, якіх з кожным годам становіцца усё больш. На жаль, жаданне чалавека пачаць здаровы лад жыцця альбо проста памяняць машыну на больш лёгкі і танны від транспарту часта спалучаецца з непрыемнасцю — веласіпеды крадуць. І такіх выпадкаў у Мінску, як сведчаць эксперты, хапае. Аб гэтай праблеме мы пагутарылі з Андрэем ПАРАШЧУКОМ, начальнікам Першамайскага РУУС г. Мінска.**



— Крадзяжы велатранспарту ўжо становяцца для нас праблемай, — кажа суразмоўца. — Падобнага раней не было. Напрыклад, за ўвесь 2008 год у нас зарэгістравалі ўсяго 17 веласіпедных крадзяжоў. Сёлета за тры месяцы зафіксавалі 21 падобны выпадак. Гадавыя паказчыкі сведчаць, што лічба павялічваецца ў 5-6 разоў. Сітуацыя па горадзе прыкладна аднолькавая. Падобны скачок звязваю з тым, што ў нашай краіне здаровы лад жыцця стаў модным. Многія перасаджваюцца на ровары. Зусім нядаўна я быў на нарадзе ў адміністрацыі раёна, заўважыў, што не толькі дзяржслужачыя, але і наведвальнікі прыязджаюць у выканкам на веласіпедах. У нашым раёне шмат месцаў, дзе любяць на іх катацца. Летась дзеля бяспекі прахожых нам нават прыйшлося забараніць уезд у Парк Чалюскінцаў, бо столькі было аматараў. З мая, дарэчы, там пачнуць працаваць велапаркоўкі. Невялічкая, ёсць і каля нашага ўпраўлення.

***— Добрая ініцыятыва. А з якіх месцаў найчасцей крадуць веласіпеды?***

— Найчасцей з калясачных, пад'ездаў... Да злачынства даволі часта прыводзіць і бестурботнасць нашых грамадзян. У сакавіку па Уручны пракацілася цэлая серыя крадзяжоў веласіпедаў. Злодзей скраў 7 ровараў. У выніку злачынства раскрылі. Але калі мы пачалі разбірацца, высветлілася, што ўсе веласіпеды вынеслі з пад'ездаў. Многія проста стаялі на лесвічных пляцоўках, у тамбурах. Яны нават не былі прышпіленыя.

***— Цікава, а якая заканамернасць была паміж гэтымі крадзяжамі?***

— Месца здзяйснення злачынства — адзін мікраён. Крадуць веласіпеды, дарэчы, у любы час: і ўначы, і вечарам, і раніцай. Як толькі рэч пакідаюць без нагляду, яна можа стаць здабычай зламысніка. Гэта асаблівасць падобных крадзяжоў. А кватэры найчасцей рабуюць тады, калі людзі на працы альбо паехалі ў адпачынак. Яшчэ два веласіпеды скралі проста з прахадной завода «Прамень». Як аказалася, злачынцамі сталі дзве нарказалежныя.

У 80 працэнтах крадзяжоў ровараў фігуруюць тыя, хто злоўжывае алкаголем ці ўжывае наркотыкі. Для іх грошы неабходны найперш для таго, каб купіць сабе дозу, выпіўку. Яны не цураюцца нічога. А ровары збываюць амаль за бясцэнак.

***— Крадуць усё запар?***

— Не, найчасцей так званыя «горнікі», сучасныя, знешне прывабныя ровары. Дзіцячыя ўсё ж такі не чапаюць.

***— Колькі каштаваў самы дарагі скрадзены веласіпед?***

— Летась мы літаральна за суткі раскрылі адно рэзананснае злачынства. Той скрадзены веласіпед быў абсталяваны навігатарам. І калі ўласнік пісаў заяву ў міліцыю, сказаў, што ровар вельмі лёгка можна знайсці праз інтэрнэт. Так і адбылося. Нам заставалася толькі чакаць у засадзе каля гаража таго, хто па яго прыйдзе. Той веласіпед з улікам навігацыі каштаваў прыблізна 3 тысячы еўра.

***— Веласіпед — гэта не аўтамабіль, нумара не мае. Ды і аднолькавых шмат. Як знаходзіце іх?***

— Веласіпеды хоць і не маюць дзяржнумара, але ў іх ёсць спецыяльны ідэнтыфікацыйны нумар. Звычайна іх прапісваюць на рамах. Акрамя таго, у большасці веласіпедаў ёсць пашпарты. Праўда, у выпадку з серыяй крадзяжоў на Уручны злачынства атрымалася раскрыць у патэнцыйным месцы збыту. Як высветлілася, злодзей намагаўся ў адным з іх прадаць два веласіпеды.

***— Ці часта ў раскрыцці падобных злачынстваў дапамагаюць пільныя грамадзяне?***

— З дапамогай жыхароў нашага раёна мы раскрываем шмат злачынстваў. З веласіпедамі таксама. Апошнім часам людзі ідуць нам насустрач. Бывае, што толькі выкладзеш у інтэрнэце відэа альбо фота магчымага падазраванага ў правапарушэнні, як неабыякавыя грамадзяне тэлефануюць і паведамляюць пра яго інфармацыю.

***— Што вас турбуе, акрамя крадзяжоў веласіпедаў?***

— Крадуць яшчэ мабільныя тэлефоны, хоць падобныя злачынствы апошнія гадоў пяць губляюць сваю актуальнасць. А вось крадзяжы ў кватэрах, зробленыя кваліфікаваным спосабам, адзінкавыя. Галаўны боль дадаюць выпадкі, калі нехта прывёў дадому новых знаёмых, а яны аказаліся зладзеямі, альбо не замкнуў за сабой дзверы. Ёсць шмат зламыснікаў, якія мэтанакіравана ходзяць па пад'ездах і наўмысна торгаюць ручкі дзвярэй, каб хутка заскочыць у адчыненыя кватэры і схапіць тое, што першым убачыць.

***— Якія даяце парады, каб прадухіліць нечаканае знікненне веласіпедаў?***

— З мерамі бяспекі павінен вызначыцца ўласнік двухколавай машыны. Я, напрыклад, стаўлю веласіпед на балконе. Можна таксама паставіць яго ў калясачнай. Аднак пакідаць на лесвічнай пляцоўцы — гэта не выхад. Яго ў такім разе не выратуе ні замок, ні дамафон ■



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

## ПАМЯТАЦЬ, КАБ ПАЗБЕГНУЦЬ АВАРЫЙ

**Доўгачаканай цеплыні рады не толькі веласіпедысты, але і гаспадары матацыклаў. Шкада, аднак, што далёка не кожны з іх выконвае правілы дарожнага руху, а часам проста ігнаруе, што прыводзіць да страшных наступстваў.**



Як паведаміла «Звяздзе» **Вікторыя ЦАРУК, старшы інспектар па агітацыі і прапагандзе АДАІ Кастрычніцкага РУУС** сталіцы, летась толькі ў Мінску адбылося 36 здарэнняў з удзелам матацыклістаў. 4 чалавекі загінулі і 34 атрымалі пашкоджанні.

Каб знізіць магчымасць аварый, Дзяржаўтаінспекцыя настойліва рэкамендуе ўладальнікам мототэхнікі перад тым, як выехаць на дарогу, абавязкова ўпэўніцца ў тэхнічнай спраўнасці транспартнага сродку.

— Як кіроўцам, так і пасажырам неабходна выкарыстоўваць зашпіленыя моташлемы і іншыя сродкі абароны, — кажа Вікторыя Царук. — Інакш матацыклістам, кіроўцам мапедаў пагражае адміністрацыйная адказнасць у выглядзе папярэджання, штрафу ў памеры адной базавай велічыні. Пры паўторным парушэнні — ад 2 да 5 базавых.

Супрацоўнікі ДАІ таксама нагадваюць, што на веласіпедзе можна ездзіць па веладарожцы, а пры яе адсутнасці — па ўзбочыне, тратуары. А калі адсутнічаюць і такія элементы дарогі, веласіпедыстам дазваляецца выязджаць на праезную частку не далей за адзін метр ад правага краю.

Пры руху па дарозе ў цёмны час сутак, пры недастатковай асветленасці на ровары ці мапедзе абавязкова павінны быць уключаны: спераду — фара, што свеціць белым святлом, ззаду — чырвоны ліхтар.

Па-за скрыжаваннямі на нерэгуляваным перасячэнні веладарожкі з аўтамабільнай дарогай веласіпедыст павінен прапусціць аўтамабілі. Па пешаходным пераходзе веласіпедыст павінен весці ровар каля сябе.

Без суправаджэння дарослых кіраваць веласіпедам забараняецца тым, каму не споўнілася 14 гадоў (акрамя пешаходных і жылых зон, веладарожак), мапедам — тым, хто не дасягнуў 16-гадовага ўзросту.

— Мы заахвочваем усіх кіроўцаў двухколавага транспарту паклапаціцца пра сваю бяспеку, — заклікае Вікторыя Царук. — І, безумоўна, памятаць, што ад вашых неабдуманых дзеянняў можа залежыць жыццё іншых.

■ Навіны «102»

## УКРАЎ ХАЛАДЗІЛЬНІК... У МАЦІ

**За крадзеж сталічныя праваахоўнікі затрымалі раней неаднойчы судзімага за аналагічныя злачынствы 30-гадовага беспрацоўнага жыхара сталіцы. На гэты раз ён «вызначыўся» тым, што ўкраў халадзільнік у роднай маці.**

Мужчына прагульваўся па раёне ў пошуках грошай і месца, дзе можна было б выпіць. Сустрэўся з сябрамі, у якіх былі такія ж памкненні. Патрэбнае пачалі шукаць ужо разам. Тут у мужчыны і ўзнікла ідэя прадаць халадзільнік 57-гадовай маці, з якой ён пражываў, паведамілі ў Першамайскім РУУС. Прыяцелі знайшлі ў газеце тэлефон майстра па рамонце і дамовіліся прадаць яму халадзільнік на запчасткі. Пакупнік пагадзіўся і на сваім мікрааўтобусе прыехаў па ўказаным адрасе. Пакуль маці была на рабоце, сын збыў маёмасць за 450 тысяч рублёў, якія тут жа пайшлі на алкаголь. Суседка, якая стала сведкай гэтага факта, выклікала міліцыю.

## КАНФІСКАВАЛІ АЎТАТАВАРАЎ НА 570 МЛН

**Супрацоўнікі аддзела па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі Фрунзенскага РУУС г. Мінска канфіскавалі буйную партыю аўтамабільных прылад на адным з прыватных прадпрыемстваў сталіцы, якое займаецца аптовым продажам.**

Падчас аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў быў устаноўлены факт захавання без кантрольных знакаў маторных масел і антыфрызаў вытворчасці Расійскай Федэрацыі. Агулам было адабрана больш за 3 тысячы адзінак тавару на суму больш за 570 мільёнаў рублёў. Па рашэнні суда прадпрыемства павінна выплаціць штраф у памеры 20 базавых велічынь. Тавар канфіскаваны. Дарэчы, раней фірма неаднаразова прыцягвалася да адміністрацыйнай адказнасці за падобныя правапарушэнні.

## «ГАЛАНТНА» АДДЗЯЧЫЎ ДЗЯЎЧЫНЕ

**25-гадовы жыхар Слуцка падазраецца ў крадзяжы грошай у сваёй дзяўчыны.**

Маладыя людзі пазнаёміліся каля месяца таму і мелі блізкія адносіны. Калі маці дзяўчыны з'ехала на адпачынак, 20-гадовая мінчанка запрасіла хлопца сумесна пажыць да яе вяртання, паведамілі ў Партызанскім РУУС. Пасля вяртання маці той павінен быў з'ехаць. Малады чалавек, як і было дамоўлена, знік. Праўда, прыхапіўшы з сабой 600 еўра і залаты ланцужок, які належаў маці дзяўчыны. Хлопцу пагражае пазбаўленне волі на тэрмін да чатырох гадоў. Раней ён ужо быў судзімы за аналагічнае злачынства.

## РАЗБОЙ НАПЯРЭДАДНІ ВЯСЕЛЛЯ

**Супрацоўнікі аддзела крымінальнага вышуку Партызанскага РУУС сталіцы пры сілавой падтрымцы супрацоўнікаў спецыяльнага атрада хуткага рэагавання затрыманы 26-гадовы малады чалавек, які падазраецца ў здзяйсненні разбойнага нападу.**

Гэты інцыдэнт адбыўся яшчэ 19 красавіка ў аддзяленні №6 Беларускага народнага банка па праспекце Незалежнасці. Невядомы мужчына з медыцынскай маскай на твары прадэманстраваў супрацоўніку банка ліст паперы з надпісам аб пагрозе выбуху і патрабаваннем перадаць яму грошы з касы. Супрацоўнік банка выклікаў міліцыю, але мужчына паспеў уцячы, паведамілі ў Партызанскім РУУС. Неўзабаве зламысніка затрымалі. Ім аказаўся 26-гадовы грамадзянін Расійскай Федэрацыі, які афіцыйна не працаўладкаваны. У Мінску малады чалавек пражываў сумесна са сваёй дзяўчынай, з якой у іх было запланавана вяселле ў чэрвені. Цяпер хлопцу пагражае пазбаўленне волі тэрмінам да 15 гадоў з канфіскацыяй маёмасці.

## АДАБРАЛІ ЛАНЦУЖОК У МІНАКА

**Оперупаўнаважанымі аддзела крымінальнага вышуку Першамайскага РУУС сталіцы разам з супрацоўнікамі спецпадраздзялення «Алмаз» па прыкметах затрыманы трое зламыснікаў, якія напалі на 60-гадовага мужчыну.**

Пацярпелы вяртаўся дадому пасля працы праз лесапаркавую зону па вуліцы Нікіфарава. Раптам на яго напалі трое мужчын, якія былі добра нападпітку. Яны сталі збіваць пацярпелага, патрабуючы грошы. Калі пачулі, што іх няма, сарвалі залаты ланцужок з крыжыкам і ўцяклі, паведамілі ў Першамайскім РУУС. Праз гадзіну яны здалі залатыя вырабы ў ламбард па праспекце Незалежнасці за крыху больш чым тры мільёны рублёў. Грошы патрацілі. Пацярпелы звярнуўся па дапамогу ў міліцыю, і неўзабаве зламыснікі былі затрыманыя па месцы жыхарства. Высветлілася, што трое мужчын (іх узрост 32 гады, 38 і 39 гадоў) беспрацоўныя, раней былі неаднаразова судзімыя за незаконнае захоўванне зброі, хуліганства, крадзяжы і рабаванні.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** rs@zviazda.by

Матэрыялы паласы падрыхтаваў Тарас ШЧЫРЫ. taras@zviazda.by

# ШАЎКОВЫ ШЛЯХ І «ВЯЛІКІ КАМЕНЬ»: суб'ектыўны погляд

**Пры інфармацыйным партнёрстве «Звязды» праходзіць конкурс эсэ, прысвечаных беларуска-кітайскім стасункам**

**Міжнароднае радыё «Беларусь» сумесна з Пасольствам Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Беларусі, Беларускім таварыствам дружбы і культурных сувязяў з замежнымі краінамі і Рэспубліканскім інстытутам кітаязнаўства імя Канфуцыя БДУ абвясцілі конкурс творчых работ (эсэ) на тэму «Беларуска-кітайскае супрацоўніцтва. Шаўковы шлях і Індустрыяльны парк «Вялікі камень» маімі вачыма». Падрабязна пра конкурс расказвае галоўны дырэктар галоўнай дырэкцыі міжнароднага вяшчання Беларускага радыё Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ.**

## ЦЯПЕР І ПА-КІТАЙСКУ

— Мы пачалі вяшчанне на кітайскай мове 1 студзеня 2013 года. Гэта было крыху нязвыкла, таму мы хваляваліся. У нас ёсць вяшчанне па-англійску, па-нямецку, па-французску, па-іспанску, па-польску, маем супрацоўнікаў, якія выдатна валодаюць гэтымі мовамі. А вось спецыялістаў, якія настолькі добра гавораць па-кітайску, каб вяшчаць па радыё, у нас, на жаль, няма. Таму перш за ўсё звярнуліся да тых носьбітаў мовы, якія жывуць у нашай краіне, вучацца ці працуюць тут. У гэтым мы пераянялі вопыт нашых калег з Міжнароднага радыё Кітая, дзе ёсць вяшчанне на беларускай мове, і дзеля таго, каб праца рабілася кваліфікавана, яны запрасілі спецыялістаў з Беларусі.

## ПАМІЖ СЯБРАМІ

— У межах праграмы «Ваш сябар — Беларусь» мы расказваем кітайскаму слухачу пра нашу краіну, тое, што адбываецца ў розных галінах жыцця — палітыцы, спорце, культуры, літаратуры, эканоміцы. Робячы праграмы, улічваем інтарэсы кітайскіх слухачоў. Як нам многія пісалі, цікавасць да нашай краіны ў Кітаі вельмі вялікая, ёсць і зацікаўленасць беларуска-кітайскімі сумеснымі праектамі. Таму, каб прыцягнуць яшчэ больш увагі да беларуска-кітайскіх стасункаў, мы вырашылі аб'явіць конкурс эсэ, якія будуць расказваць пра стаўленне слухачоў з Беларусі і Кітая да Вялікага Шаўковага шляху і сумеснага праекта «Вялікі камень». Я лічу, што гэта ўздыме цікавасць беларусаў і кітайцаў да нашых сумесных праектаў. І як вынік — гэта ўздыме цікавасць і да нашай краіны.

## ЭСЭ ДЛЯ РАДЫЁ?

— Досыць дзіўна гучыць, што радыё аб'явіла конкурс эсэ, бо эсэ — гэта перадусім друкаваныя матэрыялы. Такі конкурс аб'явілі менавіта мы, бо ўжо больш як два гады працуем у беларуска-кітайскім інфармацыйным полі, нас ужо ведаюць у Кітаі слухачы, і мы можам звяртацца непасрэдна да тых, хто цікавіцца гэтай тэмай. Адметна, што на конкурс прымаюцца эсэ на рускай, беларускай і кітайскай мовах, і наша радыё мае спецыялістаў у кітайскай мове, якія могуць агучваць матэрыялы. Мы стварылі асобную перадачу на радыё «Беларусь», якая будзе рэгулярна асвятляць ход конкурсу. Але ж сёння радыё — гэта не толькі тое, што гучыць у эфіры. Мы працуем у інтэрнэце і будзем змяшчаць урыўкі з эсэ ці тэксты цалкам на нашых старонках у інтэрнэце — на беларускай, рускай і кітайскай мовах. Адметна, што як дадаткі да конкурсных эсэ могуць далучацца фотаздымкі, аўдыя- і відэаматэрыялы.



Фота БЕЛТА.

## ТЭРМІНЫ І ЎМОВЫ

— Палажэнне прадугледжвае, што ў конкурсе эсэ могуць браць удзел як спецыялісты — журналісты, людзі, якія займаюцца непасрэдна беларуска-кітайскімі праектамі, так і тыя, хто проста хоча пакінуць свой водгук, падзяліцца думкамі, уражаннямі пра сумесныя праекты. Яшчэ адна цікавінка — мы прадугледжваем і спецыяльны прыз для журналістаў, якія будуць асвятляць ход правядзення конкурсу. Таму думаем атыўна кантактаваць са СМІ, шчодра дзяліцца матэрыяламі і спадзяёмся, што СМІ таксама зацікавяцца гэтым праектам.

У склад журы пад старшынствам прафесара, старшыні таварыства «Беларусь — Кітай» Анатоля Тозіка ўвайшлі аўтарытэтныя спецыялісты ў галіне беларуска-кітайскіх стасункаў, навукоўцы, журналісты.

Конкурс доўжыцца да канца 2016 года, яго канчатковыя вынікі будуць падведзеныя ў пачатку 2017 года. Але мяркуем падводзіць і прамежкавыя вынікі, асвятляць іх у прэсе.

**P.S.** ***Падчас нашай гутаркі з Навумам Гальпяровічам на электронны адрас конкурсу silkwayessay@gmail.com Валерый Васілеўскі з Магілёўшчыны даслаў самае першае конкурснае эсэ. Далучайцеся і вы.***

**Марына ВЕСЯЛУХА.** *vesialuha@zviazda.by*

# ЖАМЧУЖЫНЫ АЙЧЫНЫ

## На прагулку... электробусам

**Па турыстычных маршрутах у раёне прыроднай жамчужыны Беларусі — возера Свіцязь (напрыклад, да крыніц паблізу вёскі Косічы альбо курганоў каля Валеўкі) можна будзе накіравацца электробусам. Гэтым экалагічным транспартам рэспубліканскі ландшафтны заказнік «Свіцязянскі» аснашчаны дзякуючы праекту «Садзейнічанне пераходу Рэспублікі Беларусь да «зялёнай» эканомікі», які фінансуецца Еўрапейскім саюзам і рэалізуецца Праграмай развіцця ААН сумесна з Навагрудскім райвыканкамам і заказнікам.**

— У Беларусі шмат цікавых для турыстаў мясцін, але ў кожнай з іх павінен быць нейкі эксклюзіў. У заказніку «Свіцязянскі» гэта будзе электробус. Дарэчы, такі ж аўтамабіль паслужыць развіццю турызму і ў Нясвіжы, — зазначыла **кіраўнік праекта Вольга ЧАБРОЎСКАЯ.**

Электробус разлічаны на перавозку 23 пасажыраў, ёсць прыстасаванні для размяшчэння людзей з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі, хуткасць — да 80 кіламетраў у гадзіну. Падчас паездак на вялікім мультымедыйным экране пасажырам будуць паказваць фільмы на экалалагічную тэматыку. Мяркуецца, што адно зараднае прыстасаванне для электробуса будзе пастаянна знаходзіцца на яго стаянцы, а другое — на адной з кропак маршрута. У перыяды года, калі турыстаў менш, аўтамабіль можа здавацца ў арэнду, выкарыстоўвацца для гарадскіх пасажырскіх перавозак.

Зрэшты, мэта «зялёнага» праекта гэтым не абмяжоўваецца. Галоўная задача — экалагічнае выхаванне, і перш за ўсё — дзяцей. У рамках праекта на тэрыторыі заказніка ствараецца інфармацыйна-экалагічны цэнтр «Прыгоды каля возера» з тэматычнымі пляцоўкамі «Чароўны лес», «Свіцязянка», «Пляцоўка павука», «Прыпынак каля дрэва жаданняў», «Горад майстроў», «Паляна абрадаў», якія абсталююцца цікавымі інтэрактыўнымі «фішкамі».

Нядаўна на тэрыторыі заказніка прайшла экалагічная акцыя па навядзенні парадку ў прыбярэжнай зоне вадаёма, а таксама падвялі вынікі конкурсу малюнкаў «Захаваем возера Свіцязь разам!».

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*


**РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о повторном открытом аукционе по продаже апартаментов и гаражных боксов в г. Сочи, находящихся в собственности Республики Беларусь и принадлежащих ГУ «Санаторий «Беларусь» на праве оперативного управления**

| № лота | Описание лотов | Начальная цена с НДС, рос. руб. | Задаток, рос. руб. |
|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Апартамент № 001 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1632. Назначение – нежилое. Этаж – Цокольный этаж № -2. Площадь – 101,2 кв.м | 13 258 008 | 1 325 800,80 |
| Лот № 2 | Апартамент № 002 (1-но комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1629. Назначение – нежилое. Этаж – Цокольный этаж № -2. Площадь – 59,7 кв.м | 7 814 196 | 781 419,60 |
| Лот № 3 | Апартамент № 003 (1-но комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1633. Назначение – нежилое. Этаж – Цокольный этаж № -2. Площадь – 61,2 кв.м | 8 009 604 | 800 960,40 |
| Лот № 4 | Апартамент № 101 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1624. Назначение – нежилое. Этаж – Цокольный этаж № -1. Площадь – 101,7 кв.м | 13 924 944 | 1 392 494,40 |
| Лот № 5 | Апартамент № 104 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1623. Назначение – нежилое. Этаж – Цокольный этаж № -1. Площадь – 100,8 кв.м | 13 604 220 | 1 360 422 |
| Лот № 6 | Апартамент № 202 (3-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1529. Назначение – нежилое. Этаж – 2-ой. Площадь – 170,9 кв.м | 22 932 828 | 2 293 282,80 |
| Лот № 7 | Апартамент № 210 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1535. Назначение – нежилое. Этаж – 2-ой. Площадь – 97,7 кв.м | 14 269 032 | 1 426 903,20 |
| Лот № 8 | Апартамент № 211 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1527. Назначение – нежилое. Этаж – 2-ой. Площадь –123,3 кв.м | 18 007 272 | 1 800 727,20 |
| Лот № 9 | Апартамент № 305 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1543. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 116,7 кв.м | 16 441 884 | 1 644 188,40 |
| Лот № 10 | Апартамент № 306 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1545. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 98,7 кв.м | 13 905 828 | 1 390 582,80 |
| Лот № 11 | Апартамент № 308 (3-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1542. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 172,9 кв.м | 24 587 424 | 2 458 742,40 |
| Лот № 12 | Апартамент № 309 (1-но комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1544. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 60,6 кв.м | 9 024 876 | 902 487,60 |
| Лот № 13 | Апартамент № 404 (1-но комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1549. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 69,4 кв.м | 10 335 384 | 1 033 538,40 |
| Лот № 14 | Апартамент № 405 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1550. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 116,7 кв.м | 17 042 976 | 1 704 297,60 |
| Лот № 15 | Апартамент № 408 (3-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1568. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 172,9 кв.м | 24 587 424 | 2 458 742,40 |
| Лот № 16 | Апартамент № 410 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1570. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 97,7 кв.м | 14 269 032 | 1 426 903,20 |
| Лот № 17 | Апартамент № 503 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1578. Назначение – нежилое. Этаж – 5. Площадь – 103,1 кв.м | 15 057 036 | 1 505 703,60 |
| Лот № 18 | Апартамент № 505 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1593. Назначение – нежилое. Этаж – 5. Площадь – 116,7 кв.м | 17 042 976 | 1 704 297,60 |
| Лот № 19 | Апартамент № 508 (3-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1552. Назначение – нежилое. Этаж – 5. Площадь – 172,9 кв.м | 24 587 424 | 2 458 742,40 |
| Лот № 20 | Апартамент № 509 (1-но комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1553. Назначение – нежилое. Этаж – 5-ый. Площадь – 60,6 кв.м | 9 024 876 | 902 487,60 |
| Лот № 21 | Апартамент № 604 (1-но комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1579. Назначение – нежилое. Этаж – 6. Площадь – 69,4 кв.м | 10 335 384 | 1 033 538,40 |
| Лот № 22 | Апартамент № 605 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1554. Назначение – нежилое. Этаж – 6. Площадь – 116,7 кв.м | 17 042 976 | 1 704 297,60 |
| Лот № 23 | Апартамент № 608 (3-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1557. Назначение – нежилое. Этаж – 6. Площадь – 172,9 кв.м | 24 587 424 | 2 458 742,40 |
| Лот № 24 | Апартамент № 609 (1-но комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1587. Назначение – нежилое. Этаж – 6. Площадь – 60,6 кв.м | 9 024 876 | 902 487,60 |
| Лот № 25 | Апартамент № 703 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1566. Назначение – нежилое. Этаж – 7-ой. Площадь – 103,1 кв.м | 15 057 036 | 1 505 703,60 |
| Лот № 26 | Апартамент № 708 (3-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1597. Назначение – нежилое. Этаж – 7. Площадь – 172,9 кв.м | 24 587 424 | 2 458 742,40 |
| Лот № 27 | Апартамент № 803 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1591. Назначение – нежилое. Этаж – 8. Площадь – 103,1 кв.м | 15 057 036 | 1 505 703,60 |
| Лот № 28 | Апартамент № 808 (3-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1589. Назначение – нежилое. Этаж – 8-ой. Площадь – 172,9 кв.м | 24 587 424 | 2 458 742,40 |
| Лот № 29 | Апартамент № 809 (1-но комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1590. Назначение – нежилое. Этаж – 8. Площадь – 60,6 кв.м | 9 024 876 | 902 487,60 |
| Лот № 30 | Апартамент № 905 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1639. Назначение – нежилое. Этаж – 9. Площадь – 116,7 кв.м | 17 042 976 | 1 704 297,60 |
| Лот № 31 | Апартамент № 907 (5-ти комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1641. Назначение – нежилое. Этаж – 9-ый, 10-ый. Площадь – 347,2 кв.м | 48 599 244 | 4 859 924,40 |
| Лот № 32 | Апартамент № 910 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1645. Назначение – нежилое. Этаж – 9. Площадь – 97,7 кв.м | 14 269 032 | 1 426 903,20 |
| Лот № 33 | Апартамент № 1003 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1663. Назначение – нежилое. Этаж – 10. Площадь – 103,1 кв.м | 15 057 036 | 1 505 703,60 |
| Лот № 34 | Апартамент № 1004 (2-х комнатный 2-х уровневый) с кадастровым номером 23:49:0203004:1671. Назначение – нежилое. Этаж – 10-ый, 11-ый. Площадь – 139,0 кв.м | 20 301 192 | 2 030 119,20 |
| Лот № 35 | Апартамент № 1009 (1-но комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1670. Назначение – нежилое. Этаж – 10. Площадь – 60,6 кв.м | 9 024 876 | 902 487,60 |
| Лот № 36 | Апартамент № 1010 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1672. Назначение – нежилое. Этаж – 10. Площадь – 97,7 кв.м | 14 269 032 | 1 426 903,20 |
| Лот № 37 | Апартамент № 1011 (4-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1646. Назначение – нежилое. Этаж – 10-11. Площадь – 247,4 кв.м | 34 629 696 | 3 462 969,60 |
| Лот № 38 | Апартамент № 1101 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1647. Назначение – нежилое. Этаж – 11. Площадь – 108,3 кв.м | 15 817 428 | 1 581 742,80 |
| Лот № 39 | Гаражный бокс № 1 с кадастровым номером 23:49:0203004:1649. Назначение – нежилое. Этаж – Подвал №-3. Площадь – 14,9 кв.м | 1 380 600 | 138 060 |
| Лот № 40 | Гаражный бокс № 2 с кадастровым номером 23:49:0203004:1673. Назначение – нежилое. Этаж – Подвал №-3. Площадь – 14,5 кв.м | 1 363 608 | 136 360,80 |
| Лот № 41 | Гаражный бокс № 3 с кадастровым номером 23:49:0203004:1618. Назначение – нежилое. Этаж – Подвал №-3. Площадь – 14,0 кв.м | 1 342 368 | 134 236,80 |
| Лот № 42 | Гаражный бокс № 4 с кадастровым номером 23:49:0203004:1650. Назначение – нежилое. Этаж – Подвал №-3. Площадь – 12,7 кв.м | 1 287 144 | 128 714,40 |
| Лот № 43 | Гаражный бокс № 5 с кадастровым номером 23:49:0203004:1652. Назначение – нежилое. Этаж – Подвал №-3. Площадь – 13,9 кв.м | 1 338 120 | 133 812 |
| Лот № 44 | Гаражный бокс № 6 с кадастровым номером 23:49:0203004:1654. Назначение – нежилое. Этаж – Подвал №-3. Площадь – 12,7 кв.м | 1 287 144 | 128 714,40 |
| Лот № 45 | Гаражный бокс № 7 с кадастровым номером 23:49:0203004:1596. Назначение – нежилое. Этаж – Подвал №-3. Площадь – 13,2 кв.м | 1 308 384 | 130 838,40 |
| Лот № 46 | Гаражный бокс № 8 с кадастровым номером 23:49:0203004:1601. Назначение – нежилое. Этаж – Подвал №-3. Площадь – 12,8 кв.м | 1 291 392 | 129 139,20 |
| Лот № 47 | Гаражный бокс № 35 с кадастровым номером 23:49:0203004:1662. Назначение – нежилое. Этаж – Цокольный этаж -2. Площадь – 13,6 кв.м | 1 325 376 | 132 537,60 |
| Лот № 48 | Гаражный бокс № 37 с кадастровым номером 23:49:0203004:1658. Назначение – нежилое. Этаж – Подвал № -2. Площадь – 14,3 кв.м | 1 355 112 | 135 511,20 |
| Лот № 49 | Гаражный бокс № 38 с кадастровым номером 23:49:0203004:1669. Назначение – нежилое. Этаж – Подвал № - 2. Площадь – 12,1 кв.м | 1 261 656 | 126 165,60 |
| Лот № 50 | Гаражный бокс № 49 с кадастровым номером 23:49:0203004:1621. Назначение – нежилое. Этаж – Цокольный этаж -2. Площадь – 13,0 кв.м | 1 299 888 | 129 988,80 |
| Лот № 51 | Гаражный бокс № 50 с кадастровым номером 23:49:0203004:1620. Назначение – нежилое. Этаж – Цокольный этаж -2. Площадь – 14,4 кв.м | 1 359 360 | 135 936 |

**ОПИСАНИЕ АПАРТОТЕЛЯ**

Апартаменты и гаражные боксы находятся в здании апартотеля, представляющего собой монолитное 13-этажное здание (введено в эксплуатацию в апреле 2015 г.), расположенного по адресу: г. Сочи, ул. Политехническая, д. 62, в одном из самых экологически чистых районов, на круглосуточно охраняемой территории Государственного учреждения «Санаторий «Беларусь» в непосредственной близости от государственной дачи «Бочаров ручей». Апартотель расположен на земельном участке с кадастровым № 23:49:0203004:21 площадью 155 600 кв.м, предоставленном Государственному учреждению «Санаторий «Беларусь» на праве аренды по 22.09.2062. Разрешенное использование земельного участка – для размещения и эксплуатации зданий и сооружений санатория.

**УСЛОВИЯ**

К участию в аукционных торгах допускаются индивидуальные предприниматели, физические и юридические лица без ограничения, вне зависимости от государственной принадлежности, внесшие задаток по 04.05.2016. В качестве участника аукциона регистрируются лица, задаток которых поступил на расчетный счет Организатора аукциона на момент подачи заявления на участие в аукционе с иными необходимыми документами.

Валюта торгов – российский рубль. Валюта платежа — российский рубль.

Задаток за участие в аукционных торгах устанавливается в российских рублях. Сумма для оплаты задатка за участие в аукционе для резидентов Республики Беларусь производится в белорусских рублях с применением официального курса Национального банка Республики Беларусь на день платежа.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан подписать договор купли-продажи Объекта (Объектов) с Продавцом в течение 5 (пяти) дней с назначенной даты аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) в течение 30 (тридцати) дней с назначенной даты аукциона.

Передача Победителю аукциона (Претенденту на покупку) пакета документов для регистрации (оформления) права собственности осуществляется только после оплаты полной стоимости Объекта (Объектов).

Государственная регистрация договора купли-продажи Объекта (Объектов) осуществляется Победителем аукциона (Претендентом на покупку) после полной оплаты стоимости, приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) и получения перечисленной суммы Продавцом.

Все расходы по удостоверению, составлению и оформлению договора купли-продажи, уплате государственной пошлины оплачиваются Победителем аукциона (Претендентом на покупку).

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Запрет на изменение фасадной части.

Платежи и расчеты с резидентами и нерезидентами Республики Беларусь осуществляются в соответствии с законодательством Республики Беларусь, регулирующим расчеты при проведении валютных операций.

Размер штрафа, уплачиваемый участником аукциона и (или) его Победителем (Претендентом на покупку) в случаях, предусмотренных Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 №609 и соглашением о правах и обязанностях сторон в процессе организации и проведения аукциона, составляет 5% от стоимости Объекта (Объектов).

**Аукцион состоится 12.05.2016 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5%**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

*Задаток для резидентов Республики Беларусь перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369.*

Задаток для нерезидентов Республики Беларусь перечисляется на текущий счет в российских рублях 3012232138035, код 739, в ОАО «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк», 220002, г. Минск, пр. Машерова, 29. ОКПО 37492021. ПАО «Сбербанк России» г. Москва, ИНН 7707083893, БИК 044525225, к/с 30101810400000000225 в ГУ Банка России по ЦФО, счет 30111810800000000154. SWIFT код SABRRUMM.

Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов.

Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже апартаментов и гаражных боксов (Лот №__), **проводимом 12 мая 2016 г.**

Организация и проведение аукциона осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь, оформление и регистрация сделки – в соответствии с законодательством Российской Федерации.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 6. Окончание приема заявлений – 11.05.2016 в 11.30.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами аукциона. Контактное лицо для осмотра Объектов: Кришеник Сергей Иванович: 8-10-7-862-259-60-02, 8-10-7-862-259-60-12.

Организатор аукциона или Продавец вправе снять лот (лоты) с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

**☎ Организатор: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 550 09 52, 8 (029) 356-90-03 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

## ■ Дзяржава і бізнес

# Падаць заяўкі на конкурс «Прадпрымальнік года» можна да 2 мая

**Да заканчэння падачы заявак на ўдзел у нацыянальным конкурсе «Прадпрымальнік года» засталося менш за тыдзень. Згодна з умовамі этапу вылучэння кандыдатаў, 1 мая павінен быць апошнім днём для падачы дакументаў, аднак з-за таго, што ён выпадае на нядзелю, у Мінэканоміі падоўжылі тэрмін да 2 мая. Як і раней, заяўкі можна падаць асабіста альбо адправіць па пошце на працягу ўсяго дня.**

**Победитель торгов (лицо, приравненное к победителю) обязан**: в течение 3-х рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона уплатить Организатору аукциона вознаграждение по результатам аукциона в размере 2 процента от окончательной цены продажи Объекта; в течение 10 рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта; в сроки согласно заключенному договору купли-продажи выплатить Продавцу стоимость Объекта, сформированную в установленном порядке. Если между Продавцом и Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи Объекта, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты за Объект, такая оплата должна быть произведена в течение 30 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

**Организатор: РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артема, 23.**
**☎ 8 (0232) 70-46-47; 75-50-76 • www.gino.by • e-mail: info@gino.by**
**Продавец: Брагинское райпо, Гомельская обл., г.п. Брагин, пл. Ленина, 6. ☎ 8 (02344) 2-10-88; (029) 608-66-24**

## 1 июня 2016 года в 11.00 в малом зале Гомельского районного исполнительного комитета, расположенного по адресу: г. Гомель, ул. Ильича, 51а, состоится аукцион на право заключения договоров аренды земельных участков, расположенных на территории Улуковского сельсовета

| № лота | Кадастровый номер и адрес земельного участка, его размеры, целевое назначение, назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества | Срок аренды (лет) | Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений | Начальная цена предмета аукциона | Затраты на организацию и проведение аукциона в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, подлежащие возмещению победителем аукциона | Размер задатка, срок и порядок его внесения, реквизиты расчетного счета |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | 321089206601000484, строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания) площадью 0,1245 га. Гомельская область, Гомельский район, Улуковский с/с, д. Романовичи, ул. Школьная, участок №7. Имеет ограничения(обременения) прав в использовании земель. Виды ограничений (обременений) прав: земельный участок, расположенный в охранной зоне сетей и сооружений канализации, площадь – 0,0249 га | 99 | Имеется возможность подключения к электроснабжению, водоснабжению, канализации, газоснабжению. Дорога в асфальтном исполнении | 135 231 500 белорусских рублей | Расходы в сумме 9 286 000 белорусских рублей и расходы, связанные с опубликованием объявления | Задаток в сумме 13 523 200 белорусских рублей на р/с 3641414220021 филиала 302 ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 151501664, получатель – Улуковский сельский исполнительный комитет, код платежа 04002 |
| 2. | 321089200601000523, строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания) площадью 0,1253 га. Гомельская область, Гомельский район, Улуковский с/с, д. Берёзки, ул. Виноградная, 111. Имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель. Виды ограничений (обременений) прав: земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, площадь – 0,0030 га | 99 | Имеется возможность подключения к электроснабжению. Проектируется подключение водопровода. Дорога в гравийном исполнении | 49 950 700 белорусских рублей | Расходы в сумме 10 552 800 белорусских рублей и расходы, связанные с опубликованием объявления | Задаток в сумме 4 995 100 белорусских рублей на р/с 3641414220021 филиала 302 ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 151501664, получатель – Улуковский сельский исполнительный комитет, код платежа 04002 |
| 3. | 321089200601000522, строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания) площадью 0,1082 га. Гомельская область, Гомельский район, Улуковский с/с, д. Берёзки, ул. Ягодная, 126. Имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель. Виды ограничений (обременений) прав: земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, площадь – 0,0057 га | 99 | Имеется возможность подключения к электроснабжению. Проектируется подключение водопровода. Дорога в гравийном исполнении | 43 133 800 белорусских рублей | Расходы в сумме 10 853 000 белорусских рублей и расходы, связанные с опубликованием объявления | Задаток в сумме 4 313 400 белорусских рублей на р/с 3641414220021 филиала 302 ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 151501664, получатель – Улуковский сельский исполнительный комитет, код платежа 04002 |
| 4. | 321089200601000524, строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания) площадью 0,1093 га. Гомельская область, Гомельский район, Улуковский с/с, д. Берёзки, ул. Малиновая, 61. Имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель. Виды ограничений (обременений) прав: земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, площадь – 0,0040 га | 99 | Имеется возможность подключения к электроснабжению. Проектируется подключение водопровода. Дорога в гравийном исполнении | 42 256 800 белорусских рублей | Расходы в сумме 10 476 600 белорусских рублей и расходы, связанные с опубликованием объявления | Задаток в сумме 4 225 700 белорусских рублей на р/с 3641414220021 филиала 302 ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 151501664, получатель – Улуковский сельский исполнительный комитет, код платежа 04002 |
| 5. | 321089200601000521, строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания) площадью 0,1071 га. Гомельская область, Гомельский район, Улуковский с/с, д. Берёзки, ул. Ягодная, 120. Имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель. Виды ограничений (обременений) прав: земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, площадь – 0,0040 га | 99 | Имеется возможность подключения к электроснабжению. Проектируется подключение водопровода. Дорога в гравийном исполнении | 42 695 300 белорусских рублей | Расходы в сумме 10 562 400 белорусских рублей и расходы, связанные с опубликованием объявления | Задаток в сумме 4 269 500 белорусских рублей на р/с 3641414220021 филиала 302 ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 151501664, получатель – Улуковский сельский исполнительный комитет, код платежа 04002 |
| 6. | 321089200601000525, строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания) площадью 0,1028 га. Гомельская область, Гомельский район, Улуковский с/с, д. Берёзки, ул. Ягодная, 116. Имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель. Виды ограничений (обременений) прав: земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, площадь – 0,0069 га | 99 | Имеется возможность подключения к электроснабжению. Проектируется подключение водопровода. Дорога в гравийном исполнении | 40 981 100 белорусских рублей | Расходы в сумме 10 552 800 белорусских рублей и расходы, связанные с опубликованием объявления | Задаток в сумме 4 098 100 белорусских рублей на р/с 3641414220021 филиала 302 ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 151501664, получатель – Улуковский сельский исполнительный комитет, код платежа 04002 |
| 7. | 321089200601000519, строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания) площадью 0,0995 га. Гомельская область, Гомельский район, Улуковский с/с, д. Берёзки, ул. Виноградная, 108. Имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель. Виды ограничений (обременений) прав: земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, площадь – 0,0037 га | 99 | Имеется возможность подключения к электроснабжению. Проектируется подключение водопровода. Дорога в гравийном исполнении | 39 665 600 белорусских рублей | Расходы в сумме 10 467 000 белорусских рублей и расходы, связанные с опубликованием объявления | Задаток в сумме 3 966 600 белорусских рублей на р/с 3641414220021 филиала 302 ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 151501664, получатель – Улуковский сельский исполнительный комитет, код платежа 04002 |
| 8. | 321089200601000520, строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания) площадью 0,0962 га. Гомельская область, Гомельский район, Улуковский с/с, д. Берёзки, ул. Ягодная, 123. Имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель. Виды ограничений (обременений) прав: земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, площадь – 0,0041 га | 99 | Имеется возможность подключения к электроснабжению. Проектируется подключение водопровода. Дорога в гравийном исполнении | 38 350 100 белорусских рублей | Расходы в сумме 10 514 100 белорусских рублей и расходы, связанные с опубликованием объявления | Задаток в сумме 3 835 000 белорусских рублей на р/с 3641414220021 филиала 302 ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 151501664, получатель – Улуковский сельский исполнительный комитет, код платежа 04002 |

**Заявления об участии в аукционе и прилагаемые к ним документы принимаются по адресу: Гомельский район, агрогородок Улуковье, ул. Октябрьская, 1а, каб. 6, с даты опубликования по 27.05.2016 с 8.00 до 17.00, обед – 13.00–14.00, выходные дни – суббота, воскресенье.**

Условия участия в аукционе.

Аукцион проводится при наличии не менее двух участников.

Для участия в аукционе гражданин (лично либо через своего представителя) в установленный в извещении о проведении аукциона срок подает заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые предполагается получить в аренду по результатам аукциона, представляет документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка, а также заключает с Улуковским сельским исполнительным комитетом соглашение установленной формы.

Кроме того, в комиссию представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина – нотариально удостоверенную доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют документ, удостоверяющий личность.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию или организацию в указанные в извещении сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие задаток (задатки) в размере, порядке и сроки, определенные в извещении о проведении аукциона, а также заключившие соглашение.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из предметов аукциона.

После получения необходимых документов от гражданина на участие в аукционе комиссия выдает ему билет участника аукциона с указанием даты регистрации заявления и номера, под которым он будет участвовать в аукционе. Данные о каждом участнике аукциона заносятся в книгу регистрации участников аукциона.

Участник аукциона имеет право до начала аукциона письменно отозвать заявление об участии в нем. Неявка участника аукциона на аукцион приравнивается к письменному отзыву заявления об участии в нем. При этом участнику аукциона в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона возвращается сумма внесенного им задатка (задатков).

Письменный отзыв заявления или неявка участника аукциона на аукцион регистрируется в книге регистрации участников аукциона.

Прием заявлений об участии в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленный комиссией или организацией день и час, но не ранее чем за 3 рабочих дня до даты проведения аукциона. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в комиссии или организации.

Сведения об участниках аукциона не подлежат разглашению.

Перед началом аукциона его участники обязаны зарегистрироваться в комиссии и обменять билеты участников аукциона на аукционные номера, которые возвращаются в комиссию после окончания аукциона.

Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:

1. в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся:

1.1. внести плату за право заключения договора аренды земельного участка;

1.2. возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документов, необходимых для его проведения, формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого участка;

2. заключить с сельисполкомом договор аренды земельного участка и в течение двух месяцев со дня его подписания, но не позднее трех месяцев со дня утверждения протокола о результатах аукциона обратиться в Гомельский межгородской филиал республиканского унитарного предприятия «Гомельское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» за государственной регистрацией земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него (г. Гомель, ул. Войкова, 87);

3. выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в аренду победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка.

Участникам предоставляется возможность осмотра земельного участка на местности с членами комиссии (по предварительному согласованию).

**Справки по адресу: Гомельский район, агрогородок Улуковье, ул. Октябрьская, 1а, тел.: 936-275, 937-290.**



■ Падзея месяца

# ГЛЕДЗЯЧЫ НА ЎСЁ

## Што вы ўбачыце на выстаўцы найвядомейшага беларускага канцэптуаліста

**Карціна «Нягледзячы ні на што» задумвалася самадастатковай менавіта ў такім выглядзе. Абмежаванай планам — без прасторавага кантэксту, з наўмысна схаваным аб'ектам увагі персанажаў палатна. Сапраўды, яна выглядала б цалкам завершанай кампазіцыяй, але дзякуючы аднаму выпадку ўпісалася ў вандроўку і пераўтварылася ў цэлы арт-праект: аўтар Руслан Вашкевіч без задняй думкі пакінуў перад карцінай анучу і заўважыў, што героі выглядаюць якраз на ёй сканцэнтраванымі. З гэтага пачаўся доўгі і насычаны «палатняны трып», прычым у меншай ступені па музейных сценах.**

Персанажам карціны — наўмысна звычайным тыпажам са знешнасцю абывацеляў, якія выглядаюць, як «далёкія сваякі альбо суседзі па лесвічнай пляцоўцы», — давялося пабываць у краме і на звалцы, у царкве і на могілках, у стрыптыз-клубе, моргу, калоніі строгага рэжыму. Вялікае палатно перавозілася, усталёўвалася на новым месцы, трапляла ў пэўнае асяроддзе, і аб'ект увагі герояў больш не быў адасобленым і невядомым, а наадварот, станавіўся жывым, рэальным, відавочным. Уявіце, як работа глядзелася б у вашай кватэры — я ўпэўнена, арганічна. Гэтая вандроўка — кожнае новае месца — фіксавалася на здымках. Таму цяпер карціна «Нягледзячы ні на што» ў мастацкай прасторы выстаўляецца абавязкова ў суправаджэнні гэтай фотасправаздачы.

Сёння і карціну, і фота яе перамяшчэнняў, і іншыя вядомыя і не вельмі працы Руслана Вашкевіча можна ўбачыць на адмысловай выстаўцы «Канал Культура», якая праходзіць у мастацкай галерэі «Дом карцін». Пад акампанемент дзяржаўнага радыё «Культура». У Год культуры. Для тлумачэння назвы падказкай будзе той факт, што слова «канал» — шматзначнае, а на першых кроках па выстаўцы наведвальніка сустракае табурэтка з бомбай запаволенага дзеяння.

**Вялікае палатно перавозілася, усталёўвалася на новым месцы, трапляла ў пэўнае асяроддзе, і аб'ект увагі герояў больш не быў адасобленым і невядомым.**

Адзін з найвядомейшых канцэптуальных беларускіх мастакоў Руслан Вашкевіч не так даўно адзначыў круглы юбілей — сваё пяцідзесяцігоддзе. І, можна сказаць, адзначыў у тым ліку гэтай дзерзкай, па-хлапечы хуліганскай, свавольнай экспазіцыяй. У мінулы раз у Мінску персанальная выстаўка канцэптуаліста праходзіла ў Нацыянальным мастацкім музеі ў 2011 годзе, пасля якой аўтар пачаў ездзіць па іншых гарадах краіны, каб «дэцэнтралізаваць» сканцэнтраванасць сучаснага мастацтва ў сталіцы. Таму Вашкевіча на свае вочы бачылі ў Гомелі, Полацку, Віцебску. А чарговы праект у Мінску арганізаваны дзякуючы прывабнай прасторы Дома карцін. Мастак «прыйшоў, убачыў...», у сэнсе зацікавіўся заламі галерэі і загарэўся ідэяй арганізаваць тут выстаўку. І... «перамог», вядома, таксама.

Фішка сучаснага канцэптуальнага мастацтва такога кшталту і выстаўкі Руслана Вашкевіча ў прыватнасці ў тым, што ад гледача тут патрабуецца не толькі сузіранне, але і ўдзел. І не тое каб патрабуецца, ён узнікае сам сабой. Наведвальнік з задавальненнем уцягваецца ў гульню — бачыць новыя формы мастацтва, лёгка схоплівае зразумелыя і дакладныя вобразы і пасылы, становіцца ўдзельнікам гэтых кампазіцый.

Яны блізкія і даступныя настолькі, наколькі гэта магчыма — ніякага снабізму і ханжаства. Уявіце вітраж сабора кшталту гатычнай «ружы вятроў». А ці зможаце вы ўбачыць у ім анатомію? Руслан Вашкевіч стварыў праект "Таемная архітэктура" — шэраг палотнаў, дзе белым па чорным выкладзены дзівосныя прыгажосці ўзоры. З чалавечых касцей. З выяў чалавечых касцей. З'яўленне такой асацыяцыі, здавалася б, не надзвычайнае — спрацавалі ўважлівасць і знаходлівасць. Затое выкананне проста магічнае. Гэтыя палотны маглі б паслужыць не толькі «ружай вятроў» гатычнаму сабору, але і рытуальнай выявай, і акном у іншы свет.

Выстаўлена тут і нашумелая правакацыйная работа, на якой бачацца дзяўчаты ў вянках і нацыянальных касцюмах у палёце з подпісам sextourism.by. У свой час яна з'явілася ў сацсетцы Facebook з адмысловым суправаджальным тэкстам аўтара. І, зразумела ж, выклікала бурную дыскусію. Гэта сучаснае мастацтва, якое дысануе з разняволенымі Венерамі на карцінах класікаў. Можна ўспрыняць вялікае палатно sextourism.by як выхадку фрыка і абстрагавацца ад яе, а можна, наадварот, уцягнуцца ў гэту дыскусію з рэальнасцю, менавіта сучаснай і менавіта беларускай.

**Выстава «Канал Культура» паказвае тое сучаснае мастацтва, якому не трэба запаўняць адсутнасць тэхнікі доўгімі тэкстамі; у адрозненне ад шматлікіх прыкладаў, яна не будуе шматпавярховых сэнсаў.**

Культура ў розных яе стылях ці, можна сказаць, напрамках, увасоблена ў кампазіцыі «Лялькі», якая ўяўляе сабой кніжную шафу. На паліцах цэлыя зборнікі класічных аўтараў — Сервантэса, Гі дэ Мапасана, Уладзіміра Маякоўскага, Якуба Коласа, Антона Чэхава. Гэта таксама палатно, якое іграе колерамі кніжных серый. Высокае мастацтва, неабвержная класіка, мэтры літаратуры. А на карашках серый намаляваны парнаграфічныя карцінкі. Высокая літаратура і карцінкі. З аднаго боку, запоўненыя кніжныя паліцы могуць указваць на выключна вонкавую, фальшывую датычнасць да культуры. З другога, «Лялькі» паказваюць дысананс паміж неабвержным і папулярным, масавым, дзе апошняе выступае на першы план.

Як неад'емная частка культуры літаратура прысутнічае яшчэ ў адным экспанаце, што паказвае фокус, у якім тэнісныя шарыкі лунаюць над працуючымі фенамі (у гэтым выпадку шарыкі — гэта яшчэ і «вочы»). Калі ў побыце нам трэба нешта падняць, падтрымаць, нахіліць стол, мы выкарыстоўваем кнігі. Каб падтрымаць фены, выкарыстаны невыпадковыя томікі. Аўтар зноў жа ў «Фэйсбуку» задаў пытанне сваім сябрам, якія экзэмпляры яны ўзялі б на бязлюдны востраў. Адказы каля фенаў і ў стужцы сацсеткі, якая прадстаўлена на сцяне тут жа. Можна ўпісаць і свой варыянт. Біблію і "ўласную кнігу мемуараў" нехта ўжо накрэмзаў.

Шчыра кажучы, я не ўяўляю сабе наведвальніка, які б сышоў з выстаўкі Вашкевіча абыякавым. На свае вочы прыйшлося ўбачыць, як чалавек нетыпова для сябе страціў дах з жаданнем зрабіць фотаздымак ці не каля кожнага экспаната.

Выстаўка «Канал Культура» паказвае тое сучаснае мастацтва, якому не трэба запаўняць адсутнасць тэхнікі доўгімі тэкстамі; у адрозненне ад шматлікіх прыкладаў, яно не будуе шматпавярховых сэнсаў, а размаўляе з гледачом простай, зразумелай і дасціпнай мовай. Прастата гэтая таксама крыху падманлівая, бо канцэпцыю экспазіцыі яшчэ трэба разгадаць. І зрабіць гэта можна да 22 мая.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.
katsyalovich@zviazda.by

■ Форум

# ТРАДЫЦЫІ — ГЭТА МОДНА?

## Больш як 100 гасцей з 9 краін удзельнічаюць у канферэнцыі па фальклоры

**Гэтымі днямі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў праходзіць X Міжнародная канферэнцыя «Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання», прысвечаная памяці антраполага Зінаіды Мажэйкі. У праграме навуковага форуму, апроч традыцыйных пленарнага і секцыйных пасяджэнняў, — вялікая практычная частка: канцэрты аўтэнтычных і постфальклорных гуртоў з Беларусі, Польшчы, Літвы, Казахстана, майстар-класы танцораў, музыкантаў і майстроў мастацтва вуснай традыцыі, рэканструкцыя Велікоднага свята ў музеі-скансэне.**


Фота Юрыя ІВАНОВА

Так, учора прайшоў канцэрт носьбітаў «Фальклор беларускай глыбінкі», дзе выступілі гурты з Гродзенскага, Воранаўскага, Ушацкага і Любанскага раёнаў, сёння адбываюцца майстар-класы фалькларыстаў-практыкаў, а ўвечары моладзь збярэцца на энтадыскатэцы Folk-Prime, што пройдзе ў інтэрактыўным клубным фармаце. Заўтра ў музеі архітэктуры і побыту ў вёсцы Азярцо адбудзецца маляўнічая рэканструкцыя валачобнага абраду беларусаў з абыходам вёскі, спевамі, гульнямі і танцамі.

Не выпадае сумнявацца, што і ўдзельнікі, і госці канферэнцыі прыемна і з карысцю бавяць час у беларускай сталіцы. А якое месца гэты прадстаўнічы форум займае ў навуковай працы ўніверсітэта культуры і мастацтваў? Ці лёгка «запаліць» цікавасць да фальклору ў сэрцах і розумах сучасных студэнтаў? І чаму так важна вывучаць традыцыйную культуру свайго народа? З гэтымі пытаннямі карэспандэнт «Звязды» накіравалася да **прарэктара па навуковай рабоце БДУКМ Віктара ЯЗЫКОВІЧА**.

***— Віктар Робертавіч, сёння канферэнцыя, прысвечаная аўтэнтычнаму фальклору, — прадстаўнічы міжнародны форум, у якім удзельнічаюць, бадай, самыя аўтарытэтныя спецыялісты галіны з розных краін...***

— І сапраўды, маштаб сёлетняга форуму ўражвае. А ўсё пачалося яшчэ ў 2007 годзе, калі ў нашым універсітэце прайшоў веснавы навуковы форум, прысвечаны праблемам аховы і пераемнасці нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Пры гэтым акцэнт быў зроблены на комплексным і сістэмным вывучэнні розных праяў і граняў аўтэнтычнага фальклору і аналізе шляхоў яго інтэграцыі ў мастацкія і адукацыйныя рэаліі XXI стагоддзя. Думаецца, мы захавалі гэты кірунак, але кола ўдзельнікаў, тэм для абмеркавання значна пашыралася. Хачу адзначыць вельмі актыўны ўдзел нашых аспірантаў з Кітая, іх інтарэс да фальклору, захавання традыцыйнай культуры.

> «Беларускае грамадства не адмаўляецца ад каранёвых, зыходных нацыянальных традыцый, сваёй культурнай спадчыны».

***— Праца па вывучэнні, даследаванні спрадвечнай культуры беларусаў — адзін з прыярытэтных кірункаў дзейнасці ўніверсітэта?***

— Так. Мы звяртаем увагу не толькі на апісанне, вывучэнне, аналіз, інтэрпрэтацыю розных аспектаў традыцыйнай культуры, але ёсць тэндэнцыя іх узнаўлення ў дакладнай аўтэнтычнай форме. Гэта мае вельмі важнае значэнне для сучаснай навукі і культуры. Беларускае грамадства не адмаўляецца ад каранёвых, зыходных нацыянальных традыцый, сваёй культурнай спадчыны. Наадварот, працуем на тое, каб максімальна вывучыць, захаваць, аднавіць, уключыць у сучаснае жыццё і практыку ўстаноў культуры сямейна-абрадавае вымярэнне жыцця, нашы моцныя культурныя традыцыі, нашу спадчыну. Праграма рэвіталізацыі (вяртання да жыцця) традыцыйнай культуры у нашым універсітэце вельмі шырокая. Гэта не толькі канферэнцыя, над вырашэннем гэтай задачы працуюць многія кафедры.

***— Ва ўніверсітэце культуры працуе ўнікальная кафедра этналогіі і фальклору, якая рыхтуе спецыялістаў, здольных і спяваць, і танцаваць, і на інструментах іграць, і ладзіць святы. Напэўна, навуковы форум — проста свята і для студэнтаў, і для выкладчыкаў?***

— Кафедра, якой кіруе кандыдат культуралогіі Вячаслаў Калацэй, сапраўды адыгрывае вельмі важную ролю ў культурным жыцці нашага ўніверсітэта. Яна вельмі актыўна працуе і прэзентуе беларускую культуру не толькі ў сталіцы і ў іншых гарадах краіны, але і ва ўсім свеце. У працы постфальклорных калектываў, якія складаюцца са студэнтаў кожнага з курсаў, важна ўсё: і навуковы складнік, а гэта дакладная, аўтэнтычная форма ўзнаўлення фальклорных традыцый, і практычны, што прадугледжвае высокі мастацкі ўзровень выканання нумароў. Студэнты і супрацоўнікі кафедры — добрыя музыканты, спевакі і танцоры. Тры з пяці кафедральных фальклорных калектываў — стыпендыяты Фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі. Мы лічым, што ўдзел моладзі ў фальклорным руху вельмі каштоўны і значны, таму працуем на тое, каб зацікавіць максімальна шырокае кола маладых людзей нашымі традыцыямі, культурай, яе этнаграфічнымі аспектамі.

***— Адзін з самых папулярных канцэртаў на канферэнцыі — «Фальклор беларускай глыбінкі» з удзелам носьбітаў традыцыі — аўтэнтычных гуртоў з розных рэгіёнаў Беларусі. Гэта таксама прынцыповы момант праграмы — паказваць традыцыйныя спевы, танцы ў аўтэнтычным выкананні?***

— Сапраўды, вельмі важна прадстаўляць аўтэнтычных выканаўцаў з самых розных куткоў краіны. Нам цікавей за ўсё паказваць самыя аўтэнтычныя калектывы, старажытныя формы мясцовага фальклору. Ды і мясцовыя раённыя ўлады, з якімі мы кантактуем, ставяцца да нас з разуменнем і дапамагаюць у арганізацыі паездак на канферэнцыю. Вельмі важна, што прадстаўленне традыцыйнай культуры адбываецца на прэстыжных сталічных пляцоўках. Больш за тое, такая папулярнасць канцэртаў яшчэ раз даказвае: у грамадстве існуе вялікая цікавасць да фальклору. Падобныя канцэртныя праграмы маюць і вельмі важны навуковы складнік: замежныя даследчыкі з радасцю карыстаюцца магчымасцю падчас канферэнцыі пазнаёміцца з аўтэнтычнымі беларускімі гуртамі. Для гэтага не трэба ехаць у экспедыцыю, варта толькі прыехаць на форум у Мінск.

> «Удзел моладзі ў фальклорным руху вельмі значны, таму працуем, каб зацікавіць шырокае кола маладых людзей традыцыямі, культурай, яе этнаграфічнымі аспектамі».

***— Ужо другі год форум прысвячаецца памяці вядомага антраполага, даследчыцы фальклору Зінаіды Мажэйкі. Думаецца, гэта выдатны спосаб ушанаваць памяць, аддаць даніну павагі гэтай неверагоднай жанчыне, таленавітаму навукоўцу, вядомаму ва ўсім свеце. Ці адчуваецца ў гэтым кантэксце ўніверсітэтам моцная сувязь з навукоўцамі-папярэднікамі, ці існуе традыцыя пераемнасці навуковай думкі, яе непарыўнасць і развіццё?***

— Так, імя Зінаіды Мажэйкі — адно з самых знакавых ва ўсёй беларускай навуцы. Яе дзейнасць звязана з нашым універсітэтам. У 1990-я — 2000-я працавала ў нашым савеце па абароне дысертацый, падтрымлівала станаўленне кафедры этналогіі і фальклору і кірунак практычнай фалькларыстыкі. З прафесарам нашага ўніверсітэта Энгельсам Дарашэвічам Мажэйка супрацоўнічала з 1960-х гадоў, яны былі прадстаўнікамі генерацыі «шасцідзясятнікаў», аднадумцамі і сябрамі па вывучэнні і папулярызацыі беларускай культуры. Традыцыі пераемнасці пакаленняў даследчыкаў ва ўніверсітэце, безумоўна, ёсць. Папярэднікі сённяшніх нашых беларусістаў, такія знакавыя фігуры, як Зінаіда Мажэйка, Мікалай Грынчык, Іван Цішчанка, Гурый Барышаў, Мікалай Грыцкевіч ды многія іншыя — для нас з'яўляюцца «зоркамі», эталонамі, за якімі мы імкнёмся рухацца; як засведчыў «самы непрадузяты» аналітык — час, — іх унёсак у беларусазнаўства не змяншаецца з цягам часу.

***— Ці ўсе студэнты, якія навучаюцца ва ўніверсітэце культуры і мастацтваў, шчыра захоплена фальклорам? І ў цэлым, — навошта маладому пакаленню беларусаў зазіраць у глыбіні стагоддзяў і вывучаць традыцыйную культуру народа?***

— Для таго, каб па-сапраўднаму маштабна ацаніць значэнне фальклору Беларусі, патрэбна яго вельмі шырокае філасофскае асэнсаванне. У культурнагістарычнай перспектыве фальклор задае алгарытмы чалавечага жыцця ва ўсіх вымярэннях: прасторавым, часавым, сацыяльным, ва ўсіх яго асноўных кантэкстах. Гэта тая «калыска» агульначалавечай культуры, якая стварыла цалкам сучасную цывілізацыю. Думаецца, разуменне сябе і навакольнага свету, свайго месца ў сям'і і ў прыродзе — найлепшая матывацыя вывучаць фальклор. Людзі, якія прыходзяць на вучобу ў наш універсітэт, могуць і не мець адпачатку глыбокай цікавасці да традыцыйнай культуры, памкнення да яе вывучэння і спасцяжэння. Але прынамсі за час навучання гэты інтарэс абавязкова абуджаецца.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

■ Арт-карагод

# ГУЛЬНЯ З СІМВАЛАМІ

## Выставачны праект Vita-Ludi-Veritas адкрыўся ў Нацыянальным мастацкім музеі

**У цэнтры ўвагі — творчасць трох вядомых беларускіх мастакоў, каля 60-ці палотнаў і думкі аб тым, як схавацца ад паўсядзённасці. Уладзімір Тоўсцік, Алена Шлегель і Уладзімір Ганчарук — майстры вельмі розныя. Але іх аб'ядноўвае асаблівае, філасофскае бачанне жыцця, любоў да сімвалаў, рэмінісцэнцый, адлюстравання глыбокіх унутраных перажыванняў ці ўражанняў. Карыстаючыся гістарычным і фантастычным «павелічальным шклом», яны кажуць пра суб'ектыўнае. Але ў той жа час — блізкае для ўсіх.**

Карціны мастакоў здаюцца патаемнымі, вельмі інтымнымі, гучаць як споведзь, прызнанне. Жыццё, гульня і шчырасць — усё будуецца вакол гэтых паняццяў, зыходных пунктаў, якія вызначаюць быццё творцаў.

Уладзімір Тоўсцік асабліва востра адчувае штодзённасць, вышуквае ў звыклых вобразах таемны падтэкст, тое, што не на паверхні. Яго работы рэтраспектыўныя, быццам прыйшлі да нас з 1950-х ці 60-х, захоўваюць чароўнасць мінулага. Шмат перапляценняў, цытаванняў з розных эпох і стыляў, эклектыка. Любімая стыхія — гарадское асяроддзе з яго зменлівасцю і бесперапынным рухам, людзі ў натоўпе, якія раптам спыніліся, азірнуліся... Мастак ловіць погляды. Жанчына на беразе ракі выглядае як вячэрняя зорка. Дзяўчынка, што адлюстравалася ў старадаўнім люстэрку, чымсьці напалоханая. З-за пастаянных пераходаў у часе адчуваецца настальгія, але светлая — у рытмах начнога горада, водарах вясновых вуліц, ігры музыкантаў...

Жывапіс Алены Шлегель больш яркі, з мудрагелістымі сюжэтамі. Нібы музыка фарбамі. Многія элементы на карцінах пераплятаюцца, змешваюцца, утвараючы свой свет, асобны ад іншых. Аўтарка любіць звяртацца да сноў і мараў. Рамантычныя палотны мастачкі ўступаюць у барацьбу са штодзённасцю. Надзвычай вялікая палітра дэталяў, асацыяцый і алегорый стварае эфект каруселі — сташ перад творам і ляціш у іншы свет. Гэта спроба сабраць з мноства ўражанняў, прычым разнародных, адзіную схему, жангліраванне маскараднымі, гратэскнымі прыёмамі і... жаноцкасць.

Уладзімір Ганчарук таксама спалучае рэальнасць і фантастыку, нібыта гуляе з уяўленнем гледача. Знакі на карцінах даюць падставу задумацца, апускаючыся ў карнавал сэнсаў. Магія, накладанне вобразаў адзін на аднаго — тут нармальная справа. Велізарныя львы, караблі-прывіды і кракадзілы на шахматнай дошцы — гэта, сапраўды, арыгінальна.

Зашыфраванасць, неадназначнасць жывапісу, прадстаўленага на выстаўцы, дае падставу паразважаць. Наколькі нашыя веды пра жыццё аб'ектыўныя? Ці існуе ўвогуле нейкая адна ісціна? Як убачыць больш, чым ловіць звычайны позірк, зазірнуць за браму звыклага?

**Марыя ВОЙЦІК. Фота аўтара.**


Уладзімір Ганчарук. Паяц. З серыі «Царства». 2015.

■ Прэм'ера

# ДУША МАЯ



## Падмена немаўляці не гарантуе шчасця. Калі калыска-краіна спявае жалобныя песні

**Пагаджалася і спрачалася, супраціўлялася забойствам, спачувала тым, хто глядзеў у вочы смерці, захаплялася апантанымі, што дбаюць пра народ і яго шляхі. Як Ігнат Абдзіраловіч. Але герой пісьменніка Максіма Гарэцкага (і спектакля Купалаўскага тэатра «Дзве душы») надта доўга думаў, які кірунак выбраць: у часы Першай сусветнай, ды і пасля яе, усё было вельмі заблытана. Майму пакаленню было прасцей. Мы сталелі ўжо з ведамі пра той час.**

Мая душа адчувае сябе недзе як у 90-я гады. Найбольш востра ўзнікла гэтае адчуванне пасля спектакля «Дзве душы» ў Купалаўскім тэатры. Нібыта час адматаўся назад, у той час, калі тэатр сцвярдзіў сябе нацыянальным у высокім сэнсе — праз смелыя пастаноўкі рэжысёра Мікалая Пінігіна. Ён браў класіку і рабіў яе актуальнай для таго часу. Адзін з пісьменнікаў-класікаў, які пакуль не быў увасоблены на тэатральнай сцэне — Максім Гарэцкі. Пісьменнік якраз для рэжысёра Пінігіна, менавіта ўзору 90-х гадоў XX стагоддзя.

Спектакль нібыта адтуль. У той час, калі адкрылася шмат што з мінулага, гісторыя злучылася з людзьмі, усе пустыя плямы запоўніліся нечымі лёсамі, імёнамі, нумарамі закрытых спраў. Такая справа была заведзена ў гады рэпрэсій на беларускага пісьменніка Максіма Гарэцкага.

«...Таму мая аповесць засталася незавершанай», — тлумачыць у спектаклі апавядальнік, які ўвасабляе аўтара, самога Гарэцкага. Ад яго імя вядзецца расповед, паводле задумы стваральнікаў інсцэніроўкі Максіма Клімковіча і Уладзіслава Ахроменкі, гэта ход, каб састыкаваліся ва ўспрыманні гледача нейкія моманты; акрамя таго, з яго дапамогай здымаецца праблемнае пытанне наконт канцоўкі, якая ўсё адно павінна быць у спектаклі, хоць яе няма ў творы. І, па сутнасці, не парушана задума першакрыніцы.

Імкненне адпавядаць першакрыніцы адчуваецца адразу ж на пачатку спектакля «Дзве душы» ў пастаноўцы мастацкага кіраўніка тэатра Мікалая Пінігіна. Вобраз раздвоенасці душы быў знойдзены Гарэцкім як адказ на ўсе пытанні наконт самаідэнтыфікацыі беларускага народа. І цяпер часам узнікае адчуванне раздвоенасці (гэтыя два вектары дагэтуль цягнуць у розныя бакі), аднак ужо ў нас ёсць сваё месца, свая прастора.

Гэтая прастора была раздвоенай і на пачатку мінулага стагоддзя. У сацыяльным сэнсе беларускі свет падзяляўся на шляхту і сялян — два сусветы, што падкрэслена сцэнай нараджэння двух хлопчыкаў у сем'ях рознага сацыяльнага становішча. Тыя і другія маглі паразумецца, калі здаралася бяда. Каханая жонка пана Абдзіраловіча гіне ад ліхога стрэлу. Сялянка Маланка прыходзіць у дом пана, каб дапамагчы гадаваць хлопчыка. Прыходзіць са сваім сыночкам-немаўлём. Каб потым любіць па-мацярынску таго, што жыве ў панскім доме.

Назірала за тым, як яны раслі, выхоўваліся па-рознаму. Адзін у каталіцкі храм хадзіў і жагнаўся, як там вучылі. Другі, як увесь просты люд, разумеў, што казалі ў царкве. Абодва «Ойча наш» прамаўляюць: адзін па-польску, другі — на царкоўна-славянскай мове. І крыжыкі розныя. А крыж у жыцці выпаў адзін. Крыж таго народа, да якога належалі абодва. І трэба ж яго неяк называць. Вось прапанавалі азначэнне «беларусы»...



Наўрад ці толькі з-за магчымай падмены ў дзяцінстве Ігнацы (артыст Раман Падаляка) імкнецца ўслухацца і зразумець, пра што гавораць розныя агітатары. Усе асноўныя ідэі таго часу агучаны: вайна, якая па нейкім незразумелым прынцыпе робіць ворагамі тых, хто адзін аднаго разумее; камуністычнага раю, які бярэ за аснову прынцып сацыяльнага паходжання; вялікай імперыі, што не хоча адыходзіць у нябыт; народаў, якія імкнуцца вырвацца з яе абдымкаў, і асоб, якія працуюць на іх будучыню. Ігнацы пакуль што сам за сябе — чыста па-беларуску, хоць яшчэ не зразумеў цалкам сэнс гэтага азначэння.

Для Васіля (Іван Кушнярук), выхаванага ў сялянскім асяродку, нібыта ўсё проста. Як і для яго сястры Ірыны (Валянціна Гарцуева): дзяўчына з няспраўджаным каханнем ідзе ў барацьбу за беларускую ідэю. І ў той час, калі Ігнат паглядзеў і на Гаршчкоў, і на Гарэшкаў, ён таксама быццам бы намацаў нейкую важную тэму ўнутры сябе. Аднак ужо Васіль кажа пра адчуванне фальшу, пачынае вагацца. Нібыта зноў нагадвае пра сябе альтэр-эга галоўнага героя. Ці праява асаблівага менталітэту народа, які складаўся з людзей рознага паходжання і выхавання, але з аднолькавым светаўспрыманнем?

Гэтае ваганне, якое не завяршылася ў творы Гарэцкага, працягвалася далей, усё мінулае стагоддзе, да 1990-х гадоў, калі слова «беларусы» стала асэнсоўвацца наноў. Вось чаму спектакль, мне здаецца, з таго часу. І хто ведае, калі б ён выйшаў тады, можа быць, двудушнасць (і там падабаецца, але і тут добра) не працягвалася дагэтуль. Таму што няма ў ёй вобразнасці, рамантыкі (што можа чытацца ў назве). Гэтая двудушнасць мае эпічны выгляд. Як ні спрабуй абстрагавацца, задаць умоўнасці (мастацкім афармленнем спектакля ад Барыса Герлавана, у прыватнасці), яна нават формай падачы ўпарта цягне ў мінулае стагоддзе, калі ўсё для нас вырашалася. Усё, ды не ўсё. Да нявырашаных пытанняў вяртаемся, дадумваем тое, што неасэнсавана, спрабуем змяніцца па сутнасці, каб мянялася жыццё ў яго формах. Наш тэатр гэта адчувае напоўніцу — ён там. І хоча рухацца далей (ёсць жаданне сур'ёзных размоў пра тое, што дагэтуль для нас актуальна — самаідэнтыфікацыю нацыі) і не можа, таму што новае стагоддзе ўжо патрабуе іншых падыходаў у жыцці ці іншай мастацкай мовы ў творчасці.

Спектакль эпічны (нават калі меркаваць па колькасці занятых), што зноў-такі ўласціва XX стагоддзю. Рэжысёр імкнецца паказаць яго сутнасць праз лагеры розных герояў, супрацьпастаўляючы адну жорсткасць другой жорсткасці. Караючы першую, яшчэ большай. Спачатку гульня на фотакамеру падаецца фіксацыяй самых цёплых момантаў (зручны рэжысёрскі прыём, які дапамог ужо не аднаму спектаклю ў розных тэатрах). Але пакрысе цяплыня сыходзіць. Фотаздымкі аказваюцца выцягнутымі з расстрэльных спраў рэпрэсаваных жыхароў Беларусі. У тым ліку і самога Максіма Гарэцкага, які адлюстраваў у аповесці тое, што бачыў і адчуваў сам. Можа быць, дзеля таго, каб мы потым не вагаліся, не падзялялі сваю душу на часткі. Таму што не можа жыць з лёгкасцю адна частка душы, калі няма спакою другой.

Ларыса ЦІМОШЫК.
*tsimoshyk@zviazda.by*

■ Фестываль

# ГЭТА НЕ ПРОСТА ГУЛЬНЯ

## У Мінску пакажуць 14 спектакляў тэатраў лялек з шасці краін

**На IX Міжнародным фестывалі тэатраў лялек, які праходзіць у сталіцы раз на два гады, сёлета становіцца магчымым убачыць такія тэндэнцыі, якія ў нашай прасторы не атрымалі шырокага распаўсюджвання. Напрыклад, «сур'ёзныя» тэмы ў дзіцячых пастаноўках альбо вялікія формы ў рэгіянальных тэатрах. З 13 да 17 мая беларускія сцэны будуць прымаць спектаклі з Украіны, Польшчы, Літвы, Ізраіля, Расіі і, канешне, Беларусі.**

Беларуская праграма — а гэта пастаноўкі з Гомеля, Магілёва, Брэста, Гродна і Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек, які базіруецца ў Мінску, — зможа паказаць агульны вобраз лялечнага тэатра ў нашых межах. Яго можна параўнаць з тым, што прадстаўляць частка з замежнымі пастаноўкамі. Адной з іх з'яўляецца праца прыватнага тэатра «Karlsson Haus» з Санкт-Пецярбурга — «Ваня. Казка пра Ваню і загадкавую рускую душу», якая не так даўно атрымала прэстыжную расійскую нацыянальную тэатральную прэмію «Залатая маска» за найлепшую працу рэжысёра. Яшчэ да гэтага пастаноўка стала лаўрэатам Вышэйшай тэатральнай прэміі Санкт-Пецярбурга «Залаты сафіт» у намінацыях «Найлепшы спектакль у тэатры лялек» і «Найлепшая работа акцёра (Міхаіл Шэламенцаў)». А рэжысёрам спектакля з'яўляецца Аляксей Ляляўскі — галоўны рэжысёр Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек і ўласна мастацкі кіраўнік фестывалю. У Мінску ў межах форуму спектакль «Ваня» будзе двойчы паказаны на сцэне Купалаўскага тэатра — 15 і 16 мая.

У праграме бачыцца ўхіл на дарослыя спектаклі — сапраўды, лялечныя тэатры, прапануючы свой рэпертуар, разлічваюць не толькі на дзіцячую аўдыторыю. Тыя, хто бачыў на мінскай сцэне «Інтэрв'ю з вядзьмаркамі», якое таксама ўключана ў праграму, зразумеюць, пра што ідзе гаворка. Каму менш за васямнаццаць, уваход забаронены. Такое ж узроставае абмежаванне мае спектакль Пензенскага абласнога тэатра «Лялечны дом» — «Забіць Караля», дарэчы, таксама лаўрэат «Залатой маскі». У камернай абстаноўцы іграюць маленькія марыянеткі, а сама праца створана ў дзяржаўным тэатры, на чым акцэнтаваў увагу Аляксей Ляляўскі, які заўважыў таксама, што гэта «цуд, хоць здавалася б — Пенза».

«Пры складанні праграмы мы кіраваліся рэчамі, якія для любога фестывалю з'яўляюцца вызначальнымі — пляцоўкі; якасць таго, што на іх можа быць прадстаўлена; грошы, якія трэба заплаціць, каб на гэтых пляцоўках гэта якасць была прадстаўлена, — кажа Аляксей Ляляўскі. — З пляцоўкамі ў Мінску стала лепш. Другое пытанне тычыцца не толькі абстрактнай якасці, а таксама ідэі фестывалю, якую мы фармулюем. Фестываль ад фестывалю мы спрабавалі найбольш поўна прадставіць адну з краін-удзельніц. У мінулы раз гэта была Польшча, на гэты мы выбралі Расію».

У праграму трапілі адразу тры расійскія пастаноўкі, дзве з якіх — «Ваня» і «Забіць Караля» — ужо названыя. Дапоўніць гэты спіс «Трысняговая шапка», пастаўленая Краснадарскім краявым тэатрам лялек (глядзець можна дзецям ад шасці гадоў). «Гэтая пастаноўка, як вялікае палатно, — кажа мастацкі кіраўнік. — Па сваіх памерах яна змяшчаецца толькі ў ТЮГ, хоць створана краявым тэатрам лялек. Шмат нашых тэатраў таксама хочуць выйсці на вялікую колькасць гледачоў, зарабіць шмат грошай і быць шчаслівымі. Паглядзім, як гэта атрымліваецца ў Расіі».

Дарэчы, галоўным матыватарам для тэатральных калектываў паўдзельнічаць у фестывалі Аляксей Ляляўскі назваў не грошы, а саму праграму, магчымасць убачыць нешта цікавае. Пры гэтым ён сумна пажартаваў, што пры адваротным раскладзе прапанаваны план фестывалю арганізаваць не атрымалася б.

**У Мінску ў межах форуму спектакль «Ваня. Казка пра Ваню і загадкавую рускую душу» будзе двойчы паказаны на сцэне Купалаўскага тэатра — 15 і 16 мая.**

Паказаць на форуме казку «Зялёны-зялёны яблычак» прыедзе Каўнаскі дзяржаўны тэатр лялек з Літвы. «Спектакль зацікавіў нас не толькі таму, што літоўцы маюць свой уласны пункт гледжання на тэатр увогуле, на тэатр лялек і на тэатр лялек для дзяцей. Гэта не зусім звычайная пастаноўка, яна не пакажа таго, чаго чакаюць ад літоўскай трупы. Тут будзе вялікая сцэна і вялікія аб'екты. Раней такая форма часта выкарыстоўвалася ў Польшчы, і нам цікава, як яна перайшла ў літоўскае мастацтва і наколькі прадуктыўна яна можа быць выкарыстана ў нас».

Тэатр «Кей» з ізраільскага Тэль-Авіва на сцэне Купалаўскага тэатра ў Мінску пакажа спектакль «Калі ўсё было зялёным». «Дзіўна, як у Ізраілі чулліва і па-даросламу ставяцца да дзяцей. Гэта вельмі простая і пяшчотная гісторыя без слоў пра жыццё, якая іграецца двума выканальнікамі. Вельмі цікавы від тэатра, таму што ў нас з маленькімі стараюцца не размаўляць на складаныя тэмы альбо проста іх забаўляюць. «Калі ўсё было зялёным» — такі від гутаркі з дзецьмі, якога ў нас няма», — пракаментаваў выбар Аляксей Ляляўскі.

Беларуская праграма пакажа тое, што нашы тэатры напрацавалі за апошнія гады. Тут будуць пастаноўкі па Максіму Горкаму, Антону Чэхаву, Жану дэ Лафантэну, Ніколу Макіявелі, Андрэю Платонаву. Нешта з гэтага сталічныя гледачы ўжо мелі магчымасць убачыць, напрыклад «Байку» Гомельскага дзяржаўнага тэатра лялек, якая вылучаецца сваім выяўленчым рашэннем.

Праз два гады Беларускі дзяржаўны тэатр лялек будзе адзначаць 80-годдзе, таму вельмі дарэчы будзе правядзенне таксама юбілейнага — дзясятага — фестывалю тэатраў лялек. А на дзявятым па ліку дакладна можна будзе пазнаёміцца з рознымі формамі і кірункамі лялечнага тэатра.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.
*katsyalovich@zviazda.by*




## ЯК КЛІЧУЦЬ, ТАК І АДКЛІКАЮЦЦА

У 70-я гады мінулага стагоддзя вельмі шмат было брыгад шабашнікаў. Чаго яны толькі ні рабілі, чаго ні будавалі!.. Асабліва ў сельскай мясцовасці.

Дык вось. Адна з такіх брыгад і зноў жа ў адным калгасе ўзводзіла дом. Усё як належыць — падмурак, драўляны зруб, страха, вокны, падлога. А сцены — тады мода пайшла — знадворку абшывалі шалёўкай, а знутры — абівалі дранкай (па ёй потым тынкоўку рабілі).

Карацей, не тыдзень, не два працуюць мужыкі. І, вядома ж, не сакрэт, што «на ўсіх этапах работ» нешта «заганяюць», бо на будаўнічых матэрыялы попыт заўсёды быў. Іх знаёмец (і, дарэчы, з калгасных канторскіх) новы дом сабе дабудоўваў. Чарга якраз да тынкоўкі дайшла: дранка спатрэбілася. Ну і дамовіўся ён з шабашнікамі, што тыя прададуць яе: пяць вязанак за 15 рублёў.

А тады (варта сказаць) гэта немалыя грошы былі. Калі на гарэлку патраціць, чатыры бутэлькі атрымаецца і на плаўленыя сыркі яшчэ застанецца.

Значыць, падлавілі шабашнікі зручны момант, узялі з аб'екта дранку, крадком занеслі пакупніку ў пуню, якую той спецыяльна не замкнуў, і толькі пасля гэтага, як і дамаўляліся, — завіталі ў хату па разлік.

Гаспадара ж тым часам, мусіць, «жаба заела». Падумаў, як гэта за нейкую дранку аж 15 рублёў аддаць?! Ды каму? Шабашнікам, зладзюжкам, на гарэлку... Ды хопіць ім і паловы.

Карацей, адлічыў ён 7 рублёў 50 капеек, падае.

Хлопцам, вядома ж, крыўдна, бо яны так не дамаўляліся. Ды і разлічвалі на чатыры бутэлькі, а не на дзве… Але ж вырашылі схітрыць: віду не падалі. Што толку, падумалі. Гэта ж не крама, у міліцыю на падман не заявіш… Яны іншым шляхам пайшлі. Кажуць:

— Хай будзе па-твойму, Іванавіч. Адзінае — на твой новы дом пяць вязанак дранкі яўна не хопіць. Трэба — як мінімум — дзесяць. Мы можам данесці. І зараз жа… У тую ж пуню… Але, каб двойчы не хадзіць, плату давай наперад.

Пагадзіўся Іванавіч — выклаў яшчэ 7 рублёў 50 капеек.

Шабашнікі ўзялі. Потым па знаёмай сцежцы зайшлі ў пуню, кожную з прынесеных вязанак падзялілі на дзве. Сказалі самі сабе: «Усё — па-чэснаму»: было пяць — стала дзесяць. Як ты да нас, так і мы да цябе».

І сапраўды: што вінен, аддаць павінен.

**Фаіна КАСАТКІНА,**

*г. Паставы*

## ГЭТА ВАМ ПРОСТА, А НАМ…

Нехта не дурны сказаў, што ўсё незабыўнае было… учора ці пазаўчора, а не 20 гадоў, не 40 гадоў таму. Гэта так. І каб пераканацца, варта разгарнуць альбом з фотаздымкамі, варта заплюшчыць вочы і…

Некалі я вучылася ў вышэйшай партыйнай школе, у так званай «кузні кіруючых кадраў». Сярод студэнтаў каго толькі не было! Вось на фотакартцы Віктар М., тады — капітан ракетных войск. Твар у яго шчаслівы-шчаслівы, бо літаральна толькі што мы, дзве жанчынывяскоўкі, уратавалі яго ад «хваста».

…Экзамен быў па сельгасвытворчасці. І як для нас, дык пытанні лёгкія: мы іх як арэшкі лускалі. А вось вайсковец…

З аўдыторыі Віктар выйшаў чырванейшы за мак:

— Хвост, — прызнаўся з парога.

Пра інтым-паслугі я таксама спытала (хай афіцыйна эскорт і не прымае гэта). 30 хвілін падобнага задавальнення каштуюць прыкладна 50 долараў, ноч абыдзецца ў суму ад 150 долараў.

Прычын, чаму жанчыны звяртаюцца да эскорт-паслуг, мноства. Заказчыцы «арандуюць» эфектнага спадарожніка, не жадаючы марнаваць час на сур'ёзныя адносіны, калі трэба выглядаць самавіта ў вачах партнёраў. Хтосьці імкнецца выканаць патрабаванні дзелавога этыкету на важным мерапрыемстве (прыйсці са спадарожнікам). Камусьці проста няма з кім схадзіць у кіно ці сумна аднаму піць каву. Ёсць і такія, як я, хто хоча «прымусіць зайздросціць сяброўку» або раўнаваць свайго маладога чалавека. Узрост аматарак такога экстрыму вар'іруецца ў асноўным ад 20 да 35 гадоў.

Не варта думаць, што хлопцаў на гадзіну выклікаюць толькі адзінокія «лузершы». Падобнай паслугай карыстаюцца і самадастатковыя замужнія дамы. Аднак гэта спатканне носіць зусім іншы характар.

— Часта жанчынам патрэбныя проста «свабодныя» вушы. Мне расказваюць пра набалелае: сямейныя праблемы, сваркі з мужам, канфлікты на працы. Як той казаў, незнаёмаму чалавеку душу заўсёды лягчэй адкрыць, — распавядае мой новы «сябар». — Хутка дадатковую плату за паслугі псіхолага браць прыйдзецца.

### У знак сімпатыі

Акрамя Алега, пра эскорт-паслугі размаўляла я з Дзімам і Кірылам. Першы па адукацыі ваенны псіхолаг (спадзяюся, гэта яму дапамагае ў «такой» працы). Зараз у хлопца свая справа — клінінгавая кампанія. Усю перапіску з кавалерам я вяла па электронцы. Па легендзе Дзіма ў якасці майго жаніха павінен быў суправаджаць мяне на сустрэчу з аднакурснікамі.

— Усе сяброўкі замужам, а ты не? Чаму? Можаш свой фотаздымак даслаць? — нечакана чую я.

— Навошта? Вы яшчэ выбіраць будзеце? Хто з нас заказчык?! — «абураюся» я.

— Не, гэта трэба для таго, каб бліжэй пазнаёміцца і не «спаліцца», — пачынае апраўдвацца мой суразмоўца.

Далей ён удакладніў стыль адзення, наш узровень стасункаў (жывём разам ці не, колькі сустракаемся, дзе пазнаёміліся і г.д.). Дзіма хацеў больш даведацца пра мяне, каб выдуманая гісторыя «вялікага кахання» здавалася праўдападобнай. Упэўненасць перад аднакурснікамі павінна была каштаваць мне 20 долараў (стартавая цана).

Хлопец паспеў падзяліцца тым, што «вось так» два гады таму пазнаёміўся з дзяўчынай, з якой у будучым збіраліся стварыць сям'ю. Але пара праз нейкі час разбеглася. «А можа, вы мой лёс?» — выказаў здагадку Дзіма.

Кірыл жа ў тэлефоннай размове адразу адзначыў: аб'яву размясціў так даўно, што... нават і забыў пра гэта.

— Вы ў мяне першы кліент. Калі спадабаецеся адно аднаму, грошай за свае паслугі не вазьму. Чую па голасе, што вы мілая, — робіць камплімент хлопец. — Абыдземся келіхам віна і прыемнай размовай...

Быў яшчэ ў гэтым спісе хлопцаў Паша. На маё пытанне па тэлефоне, колькі каштуе гадзіна яго часу, мне адказалі, што я памылілася нумарам. А праз хвіліну прыслалі sms-паведамленне з тэкстам: «Мне нязручна зараз гаварыць, прысылайце свае прапановы наконт эскорт-паслуг на гэты адрас электроннай пошты».

Падыходы да «працы» ў хлопцаў аказаліся розныя. Адчуваецца, што самавукі і аматары...

* * *

У кавярні, нервова пазіраючы на гадзіннік, я папрасіла рахунак. На маё здзіўленне, апладзіць два кубкі кавы падахвоціўся Алег. Як правіла, у паслугі «хлопца на гадзіну» гэта не ўваходзіць — плаціць павінен заказчык. За саму паслугу мне зрабілі 50-працэнтную зніжку. Не ведаю, расцэньваць гэта як знак сімпатыі альбо як «бонус» сотаму кліенту?

**Сафія ГРОМАВА**

■ А вы ведалі?

# ПЕРАМОЖНЫЯ БОТЫ

**Кірзавыя боты — больш, чым абутак. Іван Плотнікаў, які перад вайной наладзіў іх вытворчасць, атрымаў Сталінскую прэмію. Пасля вайны ў «кірзачах» хадзілі ўсе — ад старых да школьнікаў. Яны і сёння ў хаду, таму што надзейныя.**

## КУЛЬТАВАЯ РЭЧ

К Першай сусветнай вайне ў доўгім вайсковым супрацьстаянні чаравікаў і ботаў была пастаўлена кропка. Боты аднaзначна перамаглі. Нават у тых войсках, дзе на выраб ботаў бракавала матэрыялу, ногі салдат усё роўна амаль да калена абмотвалі. Гэта была вымушаная імітацыя ботаў. У анучах гарчычнага колеру прайшлі вайну, напрыклад, брытанскія салдаты. Салдаты рускай арміі, дарэчы, у Першай сусветнай былі адзінымі, хто мог дазволіць сабе фарсіць у сапраўдных скураных ботах.



Як і пра ўсякую культавую рэч, пра кірзавыя боты ходзіць маса здагадак і чутак. Так, адной з памылак з'яўляецца тое, што «кірзачы» атрымалі сваю назву ад «Кіраўскага завода», на якім была наладжана іх вытворчасць. На самой справе сваю назву легендарныя боты атрымалі па назве ваўнянай тканіны Kersey, з якой яны першапачаткова вырабляліся. Таксама існуе маса памылак наконт таго, хто першым стварыў кірзавыя боты. Расставім кропкі над і. Прыярытэт у гэтай справе належыць рускаму вынаходніку Міхаілу Паморцаву. Брызентавую тканіну, прамочаную сумессю парафіну, каніфолі і яечнага жаўтка ён атрымаў у 1904 годзе. Матэрыял валодаў уласцівасцямі, практычна ідэнтычнымі натуральнай скуры. Ён не прапускаў ваду, але пры гэтым «дыхаў». Упершыню кірза «панюхала пораху» на Руска-японскай вайне, дзе яна выкарыстоўвалася для вырабу амуніцыі для коней, сумак і чахлоў для артылерыі. Матэрыял Паморцава заслужыў высокую ацэнку як салдат, так і экспертаў міжнародных выставак, з яго было ўжо вырашана выпусціць партыю ботаў, але масавы іх выраб так і не быў наладжаны. Спачатку справе перашкодзілі скураныя лабісты, а ў 1916 годзе Міхаіл Міхайлавіч памёр. Боты амаль на 20 гадоў «паклалі на паліцу».

## ДРУГОЕ НАРАДЖЭННЕ

Адрадзілі вытворчасць кірзы ўжо ў 1934 годзе. Савецкія навукоўцы Барыс Бызаў і Сяргей Лебедзеў распрацавалі метад атрымання таннага штучнага бутадыен-натрыевага каўчуку, якім прамочвалася тканіна, з-за чаго набывала ўласцівасці, падобныя з натуральнай скурай. Далейшаму развіццю вытворчасці кірзавых ботаў мы абавязаны хіміку Івану Плотнікаву і інжынеру Аляксандру Хамутову. Менавіта дзякуючы іх намаганням у краіне была наладжана вытворчасць «кірзачоў». Баявую праверку яны прайшлі яшчэ ў савецка-фінскую вайну, але гэты вопыт скончыўся няўдала — на марозе боты трэскаліся, станавіліся цвёрдымі і ломкімі. Дачка Плотнікава Людміла ўспамінала, як бацька распавядаў ёй пра камісію, на якой адбыўся «разбор палётаў» прымянення новага матэрыялу. У Івана Васільевіча спыталі: «Чаму ваша кірза такая халодная і не дыхае?» Ён адказаў: «Бык і карова пакуль яшчэ не падзяліліся з намі ўсімі сваімі сакрэтамі». На шчасце, за такую дзёрзкасць хіміка ніяк не пакаралі. Наадварот — пасля пачатку Вялікай Айчыннай вайны настаў відавочна востры недахоп абутку. Тут і спатрэбіўся вопыт Плотнікава. Яму было даручана ў самыя кароткія тэрміны удасканаліць тэхналогію вытворчасці кірзы. Курыраваў пытанне сам Касыгін. Плотнікаў з задачай справіўся. Больш за тое, наладзіў вытворчасць «кірзачоў» у Кіраве. 10 красавіка 1942 года Плотнікаў разам з Хамутовым і яшчэ 7 работнікам прамысловасці атрымалі Сталінскую прэмію 2-й ступені. Да канца вайны ў кірзавых ботах хадзіла 10 мільёнаў савецкіх салдат.

## ЯК СІМВАЛ ПЕРАМОГІ

Кірзавыя боты набылі за час вайны заслужаную славу. Высокія, амаль непрамакальныя, але пры гэтым паветрапранікальныя, яны дазвалялі салдатам ісці шматкіламетровыя маршы па любой дарозе і бездаражы. Пра тое, наколькі кірзавыя боты былі добрыя, можна меркаваць, калі параўнаць іх з амерыканскімі ваеннымі чаравікамі. Генерал О. Брэдлі, аўтар кнігі «Гісторыя салдата», пісаў, што з-за пастаяннай сырасці амерыканская армія пазбавілася 12 тысяч страявых салдат за адзін толькі месяц. Некаторыя з іх так і не змаглі пасля гэтага аднавіцца і вярнуцца на фронт. О. Брэдлі пісаў: «Да канца студзеня захворванне на рэўматызм ног дасягнула такіх буйных маштабаў, што амерыканскае камандаванне стала ў тупік. Мы былі зусім не падрыхтаваны да гэтага бедства ў асноўным у выніку ўласнай нядбайнасці; да таго часу, калі мы пачалі інструктаваць салдат, які патрэбен догляд нагам і што трэба рабіць, каб чаравікі не прамакалі, рэўматызм ужо распаўсюдзіўся па арміі з хуткасцю чумы». Без высокіх ботаў іануч на восеньскім і зімовым фронце даводзілася вельмі несалодка.

## АНУЧЫ

Можна прызнаць, што анучы — не менш геніяльная вынаходка, чым самі кірзавыя боты. Зрэшты, яны неразлучныя. Тыя, хто спрабаваў насіць кірзавыя боты са шкарпэткамі, ведае, што яны абавязкова рана ці позна спаўзуць на пятку. Тады, асабліва калі ты на марш-кідку і не можаш спыніцца, пішы прапала — ногі ў кроў. Акрамя таго, анучы зручныя яшчэ і тым, што ў выпадку намакання іх дастаткова наматаць другім бокам; тады нага па-ранейшаму застанецца сухой, а мокрая частка анучы будзе тым часам высыхаць. Прасторная халява «кірзачоў» дазваляе ў холадзе намотваць па дзве анучы, плюс закладваць у іх газеты для таго, каб захаваць цяпло.




## НАРОДНАЯ ЛЮБОЎ

Гэтая рэклама 1950 года, мабыць, была неабавязковай. Кірзавыя боты пасля вайны сталі «народнай маркай». На сённяшні дзень гэтага абутку выпушчана прыкладна 150 мільёнаў пар. Нягледзячы на размовы пра тое, што ў хуткім часе наша войска, і суседзяў-расіян, пераабуюць у берцы, салдаты працягваюць насіць «кірзачы», рабіць з іх «шрубы» (складваючы гармонікам) і ўпрыгожваць з нагоды дэмбеля. Магчыма, дзесьці на генетычным узроўні жыве ў нас памяць пра тое, як прайшлі маршам нашы салдаты ў кірзавых ботах да Вялікай Перамогі




■




## Вясёлы слоўнік

КАНАЛІЗАЦЫЯ — каналы на тэлебачанні.
КАШУЛЯ — рэдкая каша.
МАЛЯРЫЯ — малярны цэх.
НАХЛЕБНІК — любы інгрэдыент бутэрброда.
ПАРАДЗІХА — жонка парадыста.
РУЛЬКА — жанчына за рулём.
САДЫСТ — работнік дзіцячага садка.
САПРАНА — аматар паспаць.
ЧАСТАКОЛ — вельмі дрэнны вучань.

**Анатоль ПАЛЫНСКІ,**
*г. Беразіно.*



Малюнак Вікенція ПУЗАНКЕВІЧА.

## Казёл і агарод

*Байка*

Казла пусцілі ў агарод.
Праз год
Па дагаворы
У той канторы ў штат
Уладкаваў Казёл Казу
Даглядчыцай капусных град.
А там яшчэ праз нейкі год
У агарод
Перацягнуў Казёл
Увесь свой род.
Цяпер той агарод,
Хаця і лічыцца капусным,
Аднак чыя віна,
Што на градах
Ды на складах,
Усюды — пуста?
Няхай мараль і рэжа слых,
Я на Казла не маю зла.
А байка перш за ўсё пра тых,
Хто ў агарод пусціў Казла

**Анатоль ЗЭКАЎ.**




Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.




Малюнак Руслана БОГУША.

## Анекдоты

**Маці хуценька збірае дачушку ў дзіцячы садок. Адной рукой фарбуе сабе вейкі, другой — апранае малую. Бягуць на маршрутку. Маці глядзіць — а малая без рукавічак.**
**— Дачушка, у цябе ручкі без рукавічак не замерзлі?**
**— Не, мамачка! А вось ножкі без боцікаў — так!**

☺ ☺ ☺

Народная прыкмета.
Як дзяўчыне даведацца імя нарачонага?
Прачнуцца ў калядную ноч і паглядзець у яго пашпарт.

☺ ☺ ☺

**Муж з жонкай запрашаюць сяброў у госці:**
**— Прыходзьце да нас на Новы год.**
**— На жаль, мы не зможам, — адказваюць тыя.**
**— Гэта так ласкава з вашага боку!**

## АФАРЫЗМЫ

Сакрэт поспеху ў тым, каб выклікаць абурэнне ў як мага большай колькасці людзей.

*Бернард Шоу,*
*англійскі драматург і дзяржаўны дзеяч.*

* * *

Чаканне шчаслівых дзён бывае часам значна лепшае за гэтыя самыя дні.

*Канстанцін Паўстоўскі,*
*рускі савецкі пісьменнік.*

* * *

Каб зславіць шчасце, трэба ўмець бегаць.

*Уільям Шэкспір,*
*англійскі паэт і драматург.*

Даты | Падзеі | Людзі

### 30 КРАСАВІКА

**1769** год — нарадзіўся Міхал Шульц, літоўскі і беларускі архітэктар. У 1788 годзе скончыў Галоўную школу ВКЛ (Віленскі ўніверсітэт), з 1797-га выкладаў у ёй (з 1799 года — прафесар, узначальваў кафедру архітэктуры). У Беларусі па яго праектах пабудаваны палац Агінскіх у вёсцы Залессе на Смаргоншчыне. Распрацаваў два праекты гімназічнага комплексу ў г. Свіслач. У пачатку XIX ст. кіраваў рэстаўрацыйнымі работамі Кафедральнага сабора, касцёла Святой Ганны ў Вільні і інш. Памёр у 1812 годзе.

**1881** год — 135 гадоў таму нарадзіўся (вёска Купніна, цяпер у межах г. Чашнікі) Янка Журба (Іван Якаўлевіч Івашын), беларускі паэт, перакладчык. У 1909 годзе скончыў Глухаўскі настаўніцкі інстытут. Працаваў у Інстытуце мовы АН Беларусі. Пісаў лірычныя і прыродаапісальныя вершы, у якіх выкарыстаў народнапесенныя формы і інтанацыі. Аўтар зборнікаў вершаў «Світанкі», «Ясныя шляхі». Пісаў публіцыстычныя артыкулы і апавяданні, а таксама для дзяцей (зборнікі «Ластаўкі», «Сонечная раніца», «Светлыя дні»). Перакладаў на беларускую мову паэзію і прозу рускіх, украінскіх, грузінскіх і казахскіх пісьменнікаў. Памёр у 1964 годзе.



**1883** год — нарадзіўся Яраслаў Гашак, чэшскі пісьменнік. У юнацтве ён абышоў пешшу ўсю Аўстра-Венгерскую імперыю, а таксама і суседнія краіны. Уражанні ад гэтых падарожжаў і ад зносін з людзьмі, у тым ліку з тымі, хто апынуўся на дне жыцця, у асноўным і далі матэрыял для яго ранніх апавяданняў. Жыццёвага досведу Гашака хапіла б на дзясятак пісьменнікаў. Адзін усходні мудрэц казаў, што чалавек багаты сустрэчамі. Чэшскі бяздомны сатырык быў у гэтым сэнсе адным з самых багатых пісьменнікаў у свеце. Усё гэта не магло не адбіцца і ў яго асноўным творы — «Прыгоды бравага салдата Швейка», напісаным у 1921–1922 гадах.

Было сказана

**Кастусь КІРЭЕНКА, паэт:**
*«Светлы лёс паэта — усё жыццё імкнуцца ў маладосць».*

## НЕСПРЫЯЛЬНЫЯ ДНІ І ГАДЗІНЫ Ў МАІ

**1, нядзеля, 5.00 — 16.30**
**3, аўторак, 7.00 — 19.00**
**5, чацвер, 6.30 — 19.00**
**7, субота, 4.00 — 18.30**
**9, панядзелак, 6.00 — 19.30**
**11, серада, 9.30 — 23.00**
**13, пятніца, 19.00 — 24.00**
**14, субота, 0.00 — 8.00**
**16, панядзелак, 12.30 — 19.00**
**18, серада, 17.30 — 24.00**
**19, чацвер, 0.00 — 8.30**
**21, субота, 13.30 — 21.00**
**23, панядзелак, 17.30 — 24.00**
**24, аўторак, 0.00 — 7.30**
**26, чацвер, 3.00 — 16.30**
**28, субота, 21.00 — 23.00**
**31, аўторак, 0.00 — 2.30**

| | |
|---|---|
| **Организация** | **ООО страховой брокер «СтарЛайф СИ»** |
| **Учетный номер плательщика** | 806000602 |
| **Вид экономической деятельности** | 67201 |
| **Организационно-правовая форма** | частная |
| **Орган управления** | правление учредителей |
| **Единица измерения** | млн руб. |
| **Адрес** | г. Минск, ул. Орловская, 40-11 |

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2016 года

| Активы | Код строки | На 31 декабря 2015 года | На 31 декабря 2014 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 80 | - |
| Нематериальные активы | 120 | 54 | - |
| Доходные вложения в материальные активы | 130 | - | - |
| в том числе: инвестиционная недвижимость | 131 | - | - |
| предметы финансовой аренды (лизинга) | 132 | - | - |
| прочие доходные вложения в материальные активы | 133 | - | - |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | - | - |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | - | - |
| Отложенные налоговые активы | 160 | - | - |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 170 | - | - |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | - | - |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **134** | **-** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 93 | 1 |
| в том числе: материалы | 211 | 93 | 1 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | - | - |
| незавершенное производство | 213 | - | - |
| готовая продукция и товары | 214 | - | - |
| товары отгруженные | 215 | - | - |
| прочие запасы | 216 | - | - |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 220 | - | - |
| Расходы будущих периодов | 230 | - | - |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | - | - |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 2 045 | 586 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | 28 | 97 |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 637 | 360 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | - | - |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **2 803** | **1 044** |
| **БАЛАНС** | **300** | **2 937** | **1 044** |

| Собственный капитал и обязательства | Код строки | На 31 декабря 2015 года | На 31 декабря 2014 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 350 | 350 |
| Неоплаченная часть уставного капитала | 420 | - | - |
| Собственные акции (доли в уставном капитале) | 430 | - | - |
| Резервный капитал | 440 | - | - |
| Добавочный капитал | 450 | - | - |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 939 | 187 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | - | - |
| Целевое финансирование | 480 | - | - |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **1 289** | **537** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | - | - |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | - | - |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 540 | - | - |
| Резервы предстоящих платежей | 550 | - | - |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | - | - |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **-** | **-** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | - | - |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | - | - |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 1 648 | 507 |
| в том числе: поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 1 498 | 449 |
| по авансам полученным | 632 | - | - |
| по налогам и сборам | 633 | 36 | 35 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 34 | 7 |
| по оплате труда | 635 | 80 | 16 |
| по лизинговым платежам | 636 | - | - |
| собственнику имущества (учредителям, участникам) | 637 | - | - |
| прочим кредиторам | 638 | - | - |
| Обязательства, предназначенные для реализации | 640 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 650 | - | - |
| Резервы предстоящих платежей | 660 | - | - |
| Прочие краткосрочные обязательства | 670 | - | - |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **1 648** | **507** |
| **БАЛАНС** | **700** | **2 937** | **1 044** |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь-декабрь 2015 года

| Наименование показателей | Код строки | За январь-декабрь 2015 года | За январь-декабрь 2014 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 12 190 | 2 263 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (9 931) | - |
| Валовая прибыль (010-020) | 030 | 2 259 | 2 263 |
| Управленческие расходы | 040 | (1 433) | (2 041) |
| Расходы на реализацию | 050 | - | - |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030-040-050) | 060 | 826 | 222 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | - | - |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (16) | - |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности (±060+070-080) | 090 | 810 | 222 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | - | - |
| в том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | - | - |
| доходы от участия в уставном капитале других организаций | 102 | - | - |
| проценты к получению | 103 | - | - |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 104 | - | - |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | - | - |
| в том числе: расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | - | - |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 112 | - | - |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 137 | 8 |
| в том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | - | - |
| прочие доходы по финансовой деятельности | 122 | 137 | 8 |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | - | - |
| в том числе: проценты к уплате | 131 | - | - |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | - | - |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 133 | - | - |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности (100-110+120-130) | 140 | 137 | 8 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения (±090±140) | 150 | 947 | 230 |
| Налог на прибыль | 160 | (195) | (42) |
| Изменение отложенных налоговых активов | 170 | - | - |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 180 | - | - |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 190 | - | - |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | - | (1) |
| Чистая прибыль (убыток) (±150-160±170±180-190-200) | 210 | 752 | 187 |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | - | - |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 230 | - | - |
| Совокупная прибыль (убыток) (±210±220±230) | 240 | 752 | 187 |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию | 250 | - | - |
| Разводненная прибыль (убыток) на акцию | 260 | - | - |

## ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ
за январь-декабрь 2015 года

| Наименование показателей | Код строки | За январь-декабрь 2015 года | За январь-декабрь 2014 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **Движение денежных средств по текущей деятельности** | | | |
| Поступило денежных средств – всего | 020 | 10 988 | 2 090 |
| в том числе: от покупателей продукции, товаров, заказчиков работ, услуг | 021 | 10 877 | 2 083 |
| от покупателей материалов и других запасов | 022 | - | - |
| роялти | 023 | - | - |
| прочие поступления | 024 | 111 | 7 |
| Направлено денежных средств - всего | 030 | (10 912) | (1 730) |
| в том числе: на приобретение запасов, работ, услуг | 031 | (9 446) | (1 591) |
| на оплату труда | 032 | (779) | (90) |
| на уплату налогов и сборов | 033 | (610) | (49) |
| на прочие выплаты | 034 | (77) | - |
| Результат движения денежных средств по текущей деятельности (020-030) | 040 | 76 | 360 |
| **Движение денежных средств по инвестиционной деятельности** | | | |
| Поступило денежных средств - всего | 050 | - | - |
| в том числе: | | | |
| от покупателей основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 051 | - | - |
| возврат предоставленных займов | 052 | - | - |
| доходы от участия в уставном капитале других организаций | 053 | - | - |
| проценты | 054 | - | - |
| прочие поступления | 055 | - | - |
| Направлено денежных средств - всего | 060 | - | - |
| в том числе: на приобретение и создание основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 061 | - | - |
| на предоставление займов | 062 | - | - |
| на вклады в уставный капитал других организаций | 063 | - | - |
| прочие выплаты | 064 | - | - |
| Результат движения денежных средств по инвестиционной деятельности (050-060) | 070 | - | - |
| **Движение денежных средств по финансовой деятельности** | | | |
| Поступило денежных средств – всего | 080 | 202 | - |
| в том числе: кредиты и займы | 081 | 70 | - |
| от выпуска акций | 082 | - | - |
| вклады собственника имущества (учредителей, участников) | 083 | - | - |
| прочие поступления | 084 | 132 | - |
| Направлено денежных средств – всего | 090 | - | - |
| в том числе: на погашение кредитов и займов | 091 | - | - |
| на выплаты дивидендов и других доходов от участия в уставном капитале организации | 092 | - | - |
| на выплаты процентов | 093 | - | - |
| на лизинговые платежи | 094 | - | - |
| прочие выплаты | 095 | - | - |
| Результат движения денежных средств по финансовой деятельности (080-090) | 100 | 202 | - |
| Результат движения денежных средств за отчетный период (±040±070±100) | 110 | 278 | 360 |
| Остаток денежных средств и их эквивалентов на 31.12.2014 г. | 120 | 359 | - |
| Остаток денежных средств и их эквивалентов на конец отчетного периода | 130 | 637 | 360 |
| Влияние изменений курса иностранной валюты по отношению к белорусскому рублю | 140 | - | - |

# ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИИ СОБСТВЕННОГО КАПИТАЛА

| Наименование показателей | Код строки | Уставный капитал | Неоплаченная часть уставного капитала | Собственные акции (доли в уставном капитале) | Резервный капитал | Добавочный капитал | Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | Чистая прибыль (убыток) | Итого |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| Остаток на 31.12.2013 г. | 010 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| Корректировки в связи с изменением учетной политики | 020 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| Корректировки в связи с исправлением ошибок | 030 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| Скорректированный остаток на 31.12.2013 г. | 040 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| За январь-декабрь 2014 года | | | | | | | | | |
| Увеличение собственного капитал – всего | 050 | 350 | - | - | - | - | 25 | - | 375 |
| в том числе: | | | | | | | | | |
| чистая прибыль | 051 | 350 | - | - | - | - | 25 | - | 375 |
| переоценка долгосрочных активов | 052 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| доходы от прочих операций, не включаемые в чистую прибыль (убыток) | 053 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| выпуск дополнительных акций | 054 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| увеличение номинальной стоимости акций | 055 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| вклады собственника имущества (учредителей, участников) | 056 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| реорганизация | 057 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| | 058 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| | 059 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| Уменьшение собственного капитала - всего | 060 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| в том числе: | | | | | | | | | |
| убыток | 061 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| переоценка долгосрочных активов | 062 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| расходы от прочих операций, не включаемые в чистую прибыль (убыток) | 063 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| уменьшение номинальной стоимости акций | 064 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| выкуп акций (долей в уставном капитале) | 065 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| дивиденды и другие доходы от участия в уставном капитале организации | 066 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| реорганизация | 067 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| | 068 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| | 069 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| Изменение уставного капитала | 070 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| Изменение резервного капитала | 080 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| Изменение добавочного капитала | 090 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| Остаток на 31.12.2014 г. | 100 | 350 | - | - | - | - | 25 | - | 375 |
| Остаток на 31.12.2014 г. | 110 | 350 | - | - | - | - | 25 | - | 375 |
| Корректировки в связи с изменением учетной политики | 120 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| Корректировки в связи с исправлением ошибок | 130 | - | - | - | - | - | 162 | - | 162 |
| Скорректированный остаток на 31.12.2014 г. | 140 | 350 | - | - | - | - | 187 | - | 537 |
| За январь – декабрь 2015 года | | | | | | | | | |
| Увеличение собственного капитала - всего | 150 | - | - | - | - | - | 752 | - | 752 |
| в том числе: | | | | | | | | | |
| чистая прибыль | 151 | - | - | - | - | - | 752 | 752 | 1 504 |
| переоценка долгосрочных активов | 152 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| доходы от прочих операций, не включаемые в чистую прибыль (убыток) | 153 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| выпуск дополнительных акций | 154 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| увеличение номинальной стоимости акций | 155 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| вклады собственника имущества (учредителей, участников) | 156 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| реорганизация | 157 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| | 158 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| | 159 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| Уменьшение собственного капитала - всего | 160 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| в том числе: | | | | | | | | | |
| убыток | 161 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| переоценка долгосрочных активов | 162 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| расходы от прочих операций, не включаемые в чистую прибыль (убыток) | 163 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| уменьшение номинальной стоимости акций | 164 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| выкуп акций (долей в уставном капитале) | 165 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| дивиденды и другие доходы от участия в уставном капитале организации | 166 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| реорганизация | 167 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| | 168 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| | 169 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| Изменение уставного капитала | 170 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| Изменение резервного капитала | 180 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| Изменение добавочного капитала | 190 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| Остаток на 31.12.2015 г. | 200 | 350 | - | - | - | - | 939 | - | 1 289 |

## АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ по бухгалтерской отчетности Общество с ограниченной ответственностью страховой брокер «СтарЛайф СИ» за период с 01.01.2015 по 31.12.2015 года

Директору ООО страховой брокер «СтарЛайф СИ»
Батаеву Павлу Васильевичу

**Аудируемое лицо**: Общество с ограниченной ответственностью страховой брокер «СтарЛайф СИ», г. Минск, ул. К. Маркса, д. 40, комн. 50, зарегистрировано Министерством Финансов Республики Беларусь от 15 июля 2014 г. за № 806000602, номер свидетельства 0000042.

**Аудиторская организация**: ИП Сосновская Н.В., 222310, г. Молодечно, ул. Б. Хмельницкого, д. 3, к. 60, зарегистрирована решением Молодечненского районного исполнительного комитета 06.01.2012 года (свидетельство о регистрации № 0320689) в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 691398434.

Мною проведен аудит прилагаемой бухгалтерской отчетности **ООО СБ «СтарЛайф СИ»,** состоящей из:
- бухгалтерского баланса на 31.12.2015;
- отчета о прибылях и убытках;
- отчета об изменении собственного капитала;
- отчета о движении денежных средств за год, закончившийся на указанную дату;
- примечаний к бухгалтерской отчетности за 2015 год.

**Обязанности руководства аудируемого лица по подготовке бухгалтерской отчетности:**

Руководство **ООО СБ «СтарЛайф СИ»** несет ответственность за составление и представление бухгалтерской отчетности в соответствии с законодательством Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности и организацию системы внутреннего контроля, необходимой для составления бухгалтерской отчетности, не содержащей существенных искажений, допущенных вследствие недобросовестных действий или ошибок.

**Обязанности аудиторской организации:**

Аудитор несет ответственность за выраженное аудиторское мнение о достоверности бухгалтерской отчетности, основанное на результатах проведенного аудита.

За исключением ограничения, описанного ниже, мною проведен аудит в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь от 12 июля 2013 года «Об аудиторской деятельности» и национальных правил аудиторской деятельности, которые обязывают меня соблюдать нормы профессиональной этики, планировать и проводить аудит таким образом, чтобы обеспечить достаточную уверенность относительно наличия либо отсутствия существенных искажений в представленной бухгалтерской отчетности.

В ходе аудита мной были выполнены аудиторские процедуры, направленные на получение аудиторских доказательств, подтверждающих значения показателей бухгалтерской отчетности **ООО СБ «СтарЛайф СИ»,** а также другую, раскрытую в ней информацию. Выбор аудиторских процедур осуществлялся на основании профессионального суждения с учетом оценки риска существенного искажения бухгалтерской отчетности в результате ошибок или недобросовестных действий. При оценке риска существенного искажения бухгалтерской отчетности мной рассматривалась система внутреннего контроля **ООО СБ «СтарЛайф СИ»»,** необходимая для составления бухгалтерской отчетности, не содержащей существенных искажений, с целью планирования аудиторских процедур, соответствующих обстоятельствам аудита, но не с целью выражения мнения относительно эффективности функционирования этой системы.

Аудит также включал оценку применяемой учетной политики, обоснованности учетных оценок и общего содержания бухгалтерской отчетности **ООО СБ «СтарЛайф СИ».**

Я полагаю, что в ходе аудита мною были получены достаточные и надлежащие аудиторские доказательства, которые могут являться основанием для выражения аудиторского мнения.

**Аудиторское мнение.**

По моему мнению, бухгалтерская отчетность **ООО СБ «СтарЛайф СИ»** достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение **ООО СБ «СтарЛайф СИ»** на 31 декабря **2015** г., а также финансовые результаты деятельности и изменения финансового положения **ООО СБ «СтарЛайф СИ»** за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь.

**Аудитор – индивидуальный предприниматель: ______________________ Н.В. Сосновская**

Дата подписания аудиторского заключения: 15 марта 2016 г.

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

СВЯТА НА ПАРОЗЕ

## Як упрыгожыць велікодны куліч...

### Карункі і цукровая пудра

*Спатрэбіцца: цукровая пудра — 1 пакет, цукар — 3 ст. л., вада — 1 ст. л., какава — 1 ст. л., карункі — 1 шт.*



Прыгатуйце сіроп з какавы, цукру і вады. Натрыце шапку куліча сіропам.

Накрыйце карункамі куліч і праз сіта прасейце цукровую пудру на яго.

### Аздоба з шакаладнай стужкі



*Спатрэбіцца: пергамент — 1 шт., сіроп з какавы — 2 ст. л., растоплены шакалад — 150 г, кандытарскі мяшок або пакет.*

Нанясіце шакалад на пергамент у выглядзе сеткі. Натрыце куліч сіропам. Абгарніце куліч пергаментам з шакаладам і пакіньце застываць. Верх куліча ўпрыгожце глазурай і шакаладам. Затым выдаліце пергамент.

### Кошык з цеста для куліча



*Спатрэбіцца: прэснае цеста — 500 г, фактурныя карункі.*

Натрыце цеста алеем, прыкладзіце карункі. Перанясіце ўзор качалкай, затым змясціце цеста на пергамент і запякайце 2 хвіліны пры 180 °С. Абгарніце куліч цестам і зафіксуйце канец. Запякайце яшчэ 2 хвіліны. Упрыгожце шапку куліча глазурай.

## ...І велікодны стол

Велікодныя ўпрыгажэнні, мабыць, самы цікавы складнік усёй перадсвяточнай мітусні. Як будзе выглядаць велікодны стол, залежыць толькі ад вас, вашага густу, фантазіі. Перапяліныя яйкі, гэтак жа як і курыныя, можна пафарбаваць, гэта толькі дадасць яркасці вашаму святочнаму сталу.



Для ўпрыгожвання велікоднага стала нельга абысці бокам тэму гнязда. Спатрэбіцца сетка з тканіны, паветраныя шарыкі, клей ПВА, мох і перапяліныя яйкі. Сетку разрэжце на кавалкі адвольнай формы, надзьмiце шарыкі, добра натрыце сетку клеем і накіньце яе на шарыкі так, каб пасля высыхання клею сетка трымала форму.

На талеркі выкладзіце тканінавыя сурвэткі, зверху ўсталюйце сетку, пакладзіце ў яе мох, а на мох — перапяліныя яйкі.



Для ўпрыгожвання велікоднага стала гнёздамі можна таксама выкарыстаць каляровую паперу, нарэзаную тонкімі палоскамі, шырынёй каля 3 мм. Падрыхтуйце куфлі для марціні ці празрыстую шырокую вазу з нізкімі бакамі, у залежнасці ад таго, які памер гнязда вы плануеце. Пакладзіце ў падрыхтаваную ёмістасць паперу, сфарміруйце гняздо, а зверху — перапяліныя яйкі.

## Закуска «Кураняты»

*Спатрэбіцца: 5 буйных вараных яек, 200 г адварнога курынага мяса, 50 г масла, 1,5-2 ст. л. маянэзу; 1 вараная морква, сыр і перац чорны гарошак — для афармлення.*



Яйкі ачысціце ад шкарлупіны і разрэжце ўпоперак зігзагам. Аддзяліце бялкі ад жаўткоў. Для таго, каб кураняты не падалі, трохі зрэжце «дно» кожнага бялка. Для начынкі выкарыстоўваем жаўткі. Расцісніце іх відэльцам, дадайце масла, маянэз, здробненае варанае курынае мяса. Усё старанна перамяшайце, падсаліце і паперчыце. Сфармуйце шарыкі. Іх можна абкачаць у надзёртым на дробную тарку жаўтку або сыры, тады «кураняты» здаюцца больш пухнатымі. Начыніце шарыкамі палавінкі яек. З морквы выражце дзюбы і грабеньчыкі, з чорнага перцу гарошкам зрабіце вочкі.

## Курыца па-манастырску

Курынае філе (1 кг) разрэзаць на парцыённыя часткі і злёгку адбіць. Ачышчаныя і смажаныя грэцкія арэхі (2 шклянкі), арахіс (1 шклянка) і фундук (1 шклянка) здрабняем.



Рыхтуем тры віды кляру. У адну міску насыпаем сталовую лыжку мукі. У другой змешваем яйкі (4 шт.), муку (1 ст. л.), соль, перац і цукар. У трэцюю высыпаем здробненыя арэхі.

Стэйкі з курынага філе перад абсмажваннем трэба абкачаць у кожным з трох кляраў з двух бакоў. Смажыць на алеі да апетытнай скарыначкі.

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.35 | 20.40 | 15.05 |
| Віцебск — | 5.20 | 20.34 | 15.14 |
| Магілёў — | 5.25 | 20.30 | 15.05 |
| Гомель — | 5.27 | 20.21 | 14.54 |
| Гродна — | 5.51 | 20.54 | 15.03 |
| Брэст — | 5.57 | 20.49 | 14.52 |

## Месяц

*Апошняя квадра 6.29. Месяц у сузор'і Вадалея.*

## Імяніны

*Пр. Аляксандра, Ананії, Андрыяна, Івана, Сямёна, Фёдара.* *К. Катарыны, Лiлii, Ігара, Людвіка, Мар'яна.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




## Песню бярыце з сабой

# А Ў ПОЛІ ВЯРБА НАХІЛЁНАЯ

**Вярба ўваходзіць у нашу свядомасць з маленства. Упрыгожаныя вербныя галінкі ў перадвелікодныя дні прыносяць у грамаду адчуванне святочнасці і разумення, яшчэ цалкам не асэнсаванае, святасці гэтага дрэва. Вярба адна з першых вітае прыход вясны, мужна вытрымлівае ўсялякую непагадзь, расце там, дзе дастаткова вады ў глебе. А вада паводле павер'яў — сімвал жыцця, а крыніца — сімвал любові, кахання, і яны даюць выток жыццю. Таму ў фальклорных творах вобраз вярбы суадносіцца з лёсам жанчыны.**

У народнай песні «А ў полі вярба нахілёная» апісанне вярбы дакладна пазначае далейшую жыццёвую пуцявіну дзяўчыны. Яна мусіць цярпліва, але з годнасцю несці нялёгкі сямейны крыж — быць заканай і руплівай жонкай, клапатлівай маці, дбайнай гаспадыняй. Драматычна-напружанымі інтанацыямі «Песняры» перадаюць асноўныя быццёвыя моманты ў пачуццёвых стасунках моладзі, вылучаючы у іх маральны аспект.

З музычнай скарбніцы «Песняры» выбіралі творы, прыдатныя для духоўнага станаўлення моладзі. Па-народнаму мудрыя, меладычна-праніклівыя, лірычна-вобразныя ці жартоўна-павучальныя песні ўваходзілі ў рэпертуар. Кожная з іх, падрыхтаваная ансамблем, выглядае высокамастацкай вакальна-інструментальнай кампазіцыяй.

Артысты мужна, з гордай вераю выносілі беларускамоўныя творы на сцэнічныя падмосткі. У іх выкананні беларуская песня ўзнеслася на прэстыжную вышыню на ўсесаюзнай эстрадзе і трывала замацавалася на ёй. Гэтак узнеслася і па-мастацку магутна яна гучала і ў замежжы.

Самаадданай, карпатлівай працай «Песняры» здзейснілі грамадзянска-патрыятычны подзвіг. Узнятая імі на ўсесаюзны п'едэстал, беларуская песня сведчыла пра адметнае і плённае развіццё беларускай культуры, яе глыбокія, духоўнастваральныя карані і жыццядайны, творчы патэнцыял. Шырокае гучанне беларускай песні ў філарманічных залах, у рэспубліканскіх і ўсесаюзных радыё- і тэлепраграмах абуджала нацыянальную самасвядомасць беларусаў. Асабліва моцнае ўздзеянне рабілі песняроўскія выступленні на моладзь, на фарміраванне пачуцця нацыянальнай годнасці, вартага слаўнай гісторыі і багатай шматаблічнай культуры беларускага народа. А беларускія песні, поўныя вобразнасці і сімволікі, у спеве «Песняроў» атрымлівалі арыгінальнае ўзнаўленне і адчувалі сябе вольнымі ў новых сацыяльных і навукова-тэхнічных умовах. І адна з іх — перлінка «А ў полі вярба нахілёная» — ярка заззяла ў прамяністым вянку нацыянальнай вакальнай музыкі.




**Народная песня**

А ў полі вярба
Нахілёная,
Маладая дзяўчыненька*
Заручоная.

Заручоная
І запітая,
Тады яе запівалі,
Як сад зацвітаў.

Як сад зацвітаў,
Як зара ўзышла,
Маладая дзяўчыненька
Па ваду ішла.

Кася ад вады,
Яся да вады:
— Пастой, пастой,
мая Кася,
Дай каню вады.

— Як буду твая,
Напаю каня,
З зімненькай
крынічаньки,
З поўнага вядра.

** Апошнія два радкі кожнай страфы паўтараюцца.*

Падрыхтаваў
**Міхась ШАВЫРКІН**

## УСМІХНЕМСЯ

**Сяджу на курсах па барацьбе з нарцысізмам.**
**Я тут самы прыгожы.**

Кожны раз, калі дзяўчына адмаўляе ў спатканні добраму хлопцу, дзесьці ў свеце нараджаецца кацяня, якое будзе жыць у яе пасля сарака гадоў.

**Мужык заходзіць у рыбалоўную краму:**
**— Дзяўчына, у вас прынады сіліконавыя?**
**— Мужчына! У мяне ўсё натуральнае!**

Найлепшы тэлевізар — гэта мікрахвалеўка.
Без рэкламы і паказвае толькі ежу.

**Каб спакусіць жанчыну, патрэбныя выдатны розум, пачуццё гумару і ўпэўненасць у сабе. Грошы ў гэты пералік не ўваходзяць. Не блытайце паляванне з купляй.**

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.
Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.023. Індэкс 63850. Зак. № 1608.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Нумар падпісаны ў 19.30 29 красавіка 2016 года.